незалежная газета

№ 17 (662) 5 мая 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



| | | |
|---|---|---|
| € | 9.867,85 | Präsident Aleksander Lu |
| € | 2.353,48 | Irina Abelskaja |
| € | 1.923,80 | Vladimir Konoplev |
| € | 1.590,50 | Galina Zhuravkova |
| € | 3.345,75 | Valery Filipovich/Kashpa |
| € | 1.605,50 | Vladimir Makei |
| € | 1.807,85 | Natalia Petkovitch |
| € | 3.510,52 | Andrei Latyshonok/Niko |
| € | 3.017,90 | Oleg Karpenkov/Nikolai |
| € | 1.586,41 | Nathalie Neskrienko |
| € | 1.683,25 | Botschaftsrat Andrei Gi |

**Адпачынак Лукашэнкі за 200 тысяч. Рахункі**

Старонка 5



**«Пытать и вешать, вешать и пытать»**

Старонка 6

**Літва: аўтамабільнае шчасце**



Старонка 4

## У НУМАРЫ

**У цэнтры сямейна-шпіёнскага скандалу**

аказаўся былы пасол Польшчы ў Беларусі. **Старонка 6.**

**Грошы, якія нельга памацаць**

Сістэмы электронных аплат Беларусі. **Старонка 15.**

**«...Пайду з атрадам гарыбальдзійскіх партызан»**

Як раней нельга было пісаць пра злачынствы савецкіх партызанаў ці «асабістаў» у атрадах, так цяпер у пэўным асяродку «нямодна» згадваць злачынствы паліцаяў. Піша Віталь Тарас. **Старонка 7.**

**Ад відэакамеры не схаваешся**

Сэкс-скандалы ў Расіі. **Старонка 7.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.




# «Вынік выбараў вырашыцца на вуліцах»

Аляксандр Мілінкевіч распачаў прэзідэнцкую кампанію. **Старонка 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## «Коля, дай сюды»

На Першамай Лукашэнка падарыў сыну зборнік Караткевіча па-беларуску.

1 мая Аляксандр Лукашэнка разам з малодшым сынам Мікалаем наведаў сталічны парк Горкага. Кіраўніка дзяржавы суправаджалі бізнесмен Юрый Чыж, тэнісны трэнер Сяргей Цацэрын, трэнер хакейнага «Юнацтва» Міхаіл Захараў і выконваючы абавязкі старшыні Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька.

І Лукашэнка, і ягоны сын былі апранутыя ў спартыўную форму. У Аляксандра на масцерцы быў афіцыйны герб, а вось у Колі — не.

Найперш Лукашэнка наведаў трэніроўку хакеістаў на траве. Там яму падарылі клюшку, а таксама растлумачылі некаторыя тонкасці гульні. Пакуль Лукашэнка спрабаваў авалодаць нязвыклай для сябе клюшкай, Коля гуляўся са сваім iPhone.

Потым сын і бацька пайшлі есці бліны. І Мікалай папярэджваў тату, што спачатку трэба дачакацца, каб бліны астылі.

Але найбольш цікавым у гэтым рэпартажы выглядае своеасаблівы рэверанс Лукашэнкі ў бок беларускай мовы. Найперш ён звярнуўся да Колі па-беларуску, калі прасіў аддаць яму цукеркі: «Коля, дай сюды».

Таксама Лукашэнка прагартаў і набыў часопіс «Вясёлка», а галоўнаму рэдактару Уладзіміру Ліпскаму сказаў па-беларуску: «Дзякуй вялікі».

Ну і ўрэшце на кніжным кірмашы для сына кіраўнік дзяржавы выбраў кнігу «Лебядзіны скіт» Уладзіміра Караткевіча.

Потым Лукашэнка яшчэ набыў кілаграм сталічных цукерак. Ну а з парку з'язджаў самастойна за стырном машыны, адмовіўшыся ад паслуг ахоўнікаў.

**Зміцер Панкавец**

## Леанід Козік прапануе браць падатак з бяздзетных мужчын

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў заклікае вярнуцца да савецкай практыкі.

Галоўны прафсаюзнік краіны Леанід Козік выступіў з арыгінальнай прапановай — увесці падатак з мужчын векам ад 25 да 40 гадоў, якія не маюць дзяцей. «Калісьці такая практыка ўжо ўжывалася. Трэба да гэтага вярнуцца. Гэта і папаўненне бюджэту, і своеасаблівы стымул для тых прадстаўнікоў моцнага полу, якія сыходзяць ад свайго грамадзянскага абавязку», — растлумачыў сваю пазіцыю ён.

Згодна з ягоным планам, калі нараджаецца першае дзіця, падатак мае быць зніжаны на 50%. Пры нараджэнні другога — падатак адмяняецца. Нарадзілася трэцяе — дзяржава вяртае ўвесь выплачаны раней падатак».

Фактычна Леанід Козік прапанаваў вярнуць савецкі падатак з халасцякоў і маласямейных грамадзян. Ці, як яго называлі ў народзе, «падатак на яйцы». Ён быў уведзены ў ваенныя часы — у канцы 1941 года. Згодна з законам, бяздзетныя мужчыны ад 20 да 50 гадоў і бяздзетныя замужнія жанчыны ад 20 да 45 гадоў адлічвалі 6% заробку. Праўда, каб не плаціць, можна было атрымаць адпаведную медыцынскую даведку. Смеху дадаваў той факт, што Героі Савецкага Саюза вызваляліся ад падаткаў. Каб не размнажаліся, жартавалі людзі. Падатак праіснаваў да развалу СССР.

**Працяг на старонцы 3.**

АД РЭДАКЦЫІ

## Выбарчая кампанія і расійскія грошы

Заява Аляксандра Мілінкевіча аб тым, што ён пойдзе ў прэзідэнты, дала старт рэальнай выбарчай кампаніі. Характэрна, што яе пачатак праходзіць пад акампанемент чутак аб упырску расійскіх грошай.

Ёсць лідэры апазіцыі — не Мілінкевіч, — якія ці то маюць расійскую падтрымку, ці то хочуць яе атрымаць, ці то не маюць яе, але гэткім спосабам блефуюць.

Спадзявацца на расійскую падтрымку — маральна гібельна, а палітычна — інфантыльна.

Спадзявацца на расійскія грошы — маральна гібельна, а палітычна — інфантыльна.

Смешна, калі палітыкі, ужо лысыя, а паводзяць сябе як дзеці, наступаючы на тыя самыя граблі, што іхнія папярэднікі 9, 7 і 5 гадоў таму.

Калі палітык глядзіць у той бок, гэта паказвае: яго пазіцыі нястойкія. Гэта не лідэр для апазіцыі.

Гандаль з Расіяй, ва ўсіх сэнсах гэтага слова, — без таго не абысціся ні апазіцыі, ні любому будучаму кіраўніку Беларусі. Але ніякія таемныя дамовы з Масквой недапушчальныя, яны гібельныя для асобных палітыкаў, як яны былі б гібельныя для краіны, калі б яны заключаліся ад імя краіны. Маскоўскія грошы стануць каменем, які пацягне гэтых палітыкаў на дно.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**29 красавіка журналісткі (злева направа) Марына Коктыш, Ірына Халіп, Наталля Радзіна і Святлана Калінкіна правялі прэс-канферэнцыю. У сакавіку іх камп'ютары былі канфіскаваныя ў рамках справы аб «паклёпе на старшыню гомельскага УКДБ Івана Каржа». Нядаўна следчы даручыў крыміналістам узламаць паролі электронных паштовых скрыняў журналістак і прачытаць іх ліставанне.**

## Выдаўцы ідуць да Ананіч

3 мая — Сусветны дзень свабоды прэсы. У Беларусі ж 5 мая адзначаецца Дзень друку.

Амаль у гэты самы час рэдактары недзяржаўных рэгіянальных выданняў маюць сустрэцца з наместнікам міністрам інфармацыі Ліліяй Ананіч. Сустрэча запланаваная на 12 мая.

Цягам года Міністэрства інфармацыі не зарэгістравала некалькі незалежных газет: «Новая газета Бобруйска», «Магілёўскі час», «Мар'інагорская», «Прэфект-плюс» (Глыбокае), «Куцейна» (Орша), «Салігорск-плюс» ды іншыя.

Сярод прычын, праз якія было адмоўлена ў рэгістрацыі: размяшчэнне рэдакцыі ў жылым памяшканні, адсутнасць вышэйшай адукацыі ў рэдактара, скасаванне дамовы арэнды, неадпаведнасць заяўленай тэматыцы, неадпаведнасць звестак пра рэдактара і аб адрасе.

Эксперты мяркуюць, што большасць прычын для нерэгістрацыі былі абсалютна надуманымі. І Міністэрства інфармацыі мусіць змяніць сваё рашэнне. З такой мэтай і задуманая сустрэча са спн. Ананіч.

Дарэчы, 9 сакавіка выйшаў загад Міністэрства інфармацыі аб скасаванні шэрагу СМІ, якія не прайшлі перарэгістрацыі. Большасць з іх даўно ўжо не выдавалася.

Пазбаўленыя ліцэнзіі выдаўцы «БДГ. Деловая газета», рэгіянальных «Витебский курьер М» і «Гоман Барысаўшчыны», уніяцкай газеты «Царква», што выдавалася ў Брэсце.

Але не варта думаць, што скасаваныя толькі незалежныя выданні. Скасаваныя і такія газеты, як «Клубничка», «Любовные привороты и гадания» ці часопіс «Лесавік».

**Зміцер Панкавец**

## Сціслa

**• Урад Кыргызстана патрабуе выдаць Бакіева.** Часовы ўрад Кыргызстана пазбавіў зрынутага прэзідэнта Курманбека Бакіева недатыкальнасці і даручыў Генпракуратуры забяспечыць яго экстрадыцыю. Бакіеў завочна абвінавачаны ў арганізацыі забойстваў і злоўжыванні службовым становішчам. Ад 19 красавіка ён знаходзіцца ў Беларусі, дзе жыве ў адной з Лукашэнкавых рэзідэнцый «пад аховай беларускай дзяржавы».

**• Пасол Польшчы ў Беларусі прызначаны віцэ-міністрам.** Генрык Літвін пакінуў Беларусь пасля катастрофы польскага ўрадавага самалёта пад Смаленскам, калі загінуў таксама намеснік міністра замежных справаў. Пасольства чакае прызначэння новага кіраўніка. Г. Літвін быў прызначаны паслом у лютым 2006 года.

**• Цёпла, але з дажджамі.** 6—7 мая ў Беларусі чакаецца воблачнае надвор'е з дажджамі, а дзе-нідзе — з навальніцамі. 6 мая ноччу па захадзе Віцебскай вобласці чакаюцца нават прымаразкі да 0 — мінус 2°С, хоць тэмпература днём будзе сягаць плюс 17°С, а па поўдні краіны нават 25°С. У Мінску 6 мая воблачна з праясненнямі, кароткачасовы дождж. Тэмпература днём плюс 12—14°С. 7 мая дажджы не перастануць, але пацяплее яшчэ на пару градусаў: днём плюс 19—25°С, па паўднёвым усходзе да плюс 27°С.

**• У Беларусь пусцяць замежныя страхавыя кампаніі.** Мінфінансаў ініцыюе змены ўмоў страхавой дзейнасці ў Беларусі. Праект прадугледжвае роўныя магчымасці для страхоўшчыкаў. Прапануецца даць замежным страхоўшчыкам права страхавання жыцця ў Беларусі.

**• Вулкан яшчэ курыцца.** Улады Ірландыі і Вялікабрытаніі зноў абмежавалі палёты ў сувязі з новым воблакам вулканічнага попелу. Усе аэрапорты Ірландыі, а таксама частка аэрадромаў Шатландыі былі часова зачыненыя ў аўторак.

**СМ**

## «Хлопцы з белай скурай» маюць кароткую памяць

Фанаты «Дынама» вывесілі нацысцкі банер.

Матч «Дынама» (Мінск) — «Віцебск» 28 красавіка азмрочыла экстрэмісцкая выхадка. Падчас матча фанаты вывесілі банер, які ўсхваляе Рудольфа Геса — намесніка Гітлера.



Цікава, што на той самы матч міліцыя забараніла пранесці беларускамоўны банер з Пагоняй.

Старшыня дысцыплінарнага камітэта Федэрацыі футбола Уладзімір Вітушка заявіў, што гэта «абуральны выпадак».

Кіраўніцтва «Дынама» і лідэры фанацкага руху ўжо папрасілі прабачэння. Гэта ўжо не першы такі інцыдэнт. Некалі фанам забаранілі вывешваць банер са словамі «Хлопцы з белай скурай і блакітнай крывёй».

**ЗП**

### Самае чытанае на nn.by за 28 красавіка — 4 мая

- Скандальны адпачынак Лукашэнкі ў Аўстрыі
- «Коля, дай сюды»
- Мілінкевіч: Вынік выбараў вырашыцца на вуліцах
- Мікалай Лукашэнка валодае iPhone
- Фанаты мінскага «Дынама» вывесілі банер, які ўсхваляе нацыста Геса
- Порна з расійскай апазіцыяй у галоўнай ролі
- Бальшавікі адсвяткавалі Першамай пад смех мінакоў
- Падкажыце рэкламны слоган для «НН»
- Бачылі мы Вашы круглыя сталы з Ганчарыкам
- Абраная «Міс Беларусь–2010» + фота

### nn@nn.by

Вось з'явіўся ж беларускамоўны міністр культуры, шаноўны спадар Латушка, і думаецца: а мо калі-небудзь і наш урад будзе весці пасяджэнні на сваёй мове.

**Стэфанія Лістападская**

### ARCHE ў Наваполацку

12 мая (серада) у 17.00 у Наваполацку, у бібліятэцы імя Якуба Коласа (Маладзёжная, 104) адбудзецца прэзентацыя спецпраекта часопіса ARCHE «Хронікі і летапісы Беларусі: сярэднявечча і раннемадэрны час» з удзелам укладальніка Васіля Вароніна і рэдактара Валера Булгакава. Будуць прадстаўленыя і іншыя навінкі кнігадруку. Уваход вольны.




# Не ўсё ў жыцці апошні раз

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам даставіць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г. Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрс. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

**Вользе А.** з Любанскага раёна.
**Аляксандру А.** з Нясвіжскага раёна.
**Сяргею Ю.** з Лепельскага раёна.
**М.Р.** з Рэчыцкага раёна.
**А.П., С.В.** з Гродна.
**Пятру К.** з Мастоўскага раёна.
**Андрэю К.** з Бярозаўскага раёна.

# Аўтуховіча будуць сустракаць з кветкамі

**6 мая ў Вярхоўным судзе ў 14.30 будзе абвешчаны прысуд па крымінальнай справе ваўкавысцаў.**

Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенкі, Міхаіла Казлова і Аляксандра Ларына.

Намеснік старшыні «Маладога фронту» Мікола Дземідзенка заклікае прыходзіць да Вярхоўнага суда з кветкамі. «Мы занадта песімістычна настроены. Лічым, што ўсё ўжо вырашана, але давайце прыйдзем не на прысуд, а сустракаць Аўтуховіча. Трэба браць з сабой кветкі, каб годна іх сустрэць».

16 красавіка пракурор Эльдар Сафараў запатрабаваў прыгаварыць Аўтуховіча да 20 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці, Асіпенку і Ларына — да 11 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Для Міхаіла Казлова ён запрасіў тры гады калоніі агульнага рэжыму без права займаць кіруючыя пасады.

Праваабаронца Алег Воўчак практычна кожны дзень прысутнічаў на судовым працэсе.

«І ў Беларусі, і за мяжой мяне часта пытаюцца: чаму асоба Мікалая Аўтуховіча прыцягнула такую ўвагу беларускіх уладаў? Гэта не быў партызанскі атрад, як хочуць паказаць на судзе, а група аднадумцаў, што расследавалі карупцыю ў сваім рэгіёне. Яны знайшлі карупцыю ў тым органе, дзе яе не можа быць, у аддзяленні Міністэрства па падатках і зборах. Яны даведаліся, як сістэма зарабляе грошы. Частка грошай даставалася мясцовым чыноўнікам, а астатнія ішлі далей», — кажа А.Воўчак.

Праваабаронца расказвае, што яшчэ ў 2003 годзе адна з інспектарак адкрыта сказала Аўтуховічу: калі ён хоча весці бізнес, то павінен плаціць грошы. Аўтуховіч адмовіўся. Пасля чаго і пачаліся ў яго праблемы.

Юрыст Алеся Мураўёва звяртае ўвагу на шэраг недакладнасцяў і незразумелых рэчаў падчас разбіральніцтваў. Напрыклад, як Ларын са свайго месца на тэрыторыі школы-ліцэя хацеў трапіць у старшыню Гродзенскага аблвыканкама Саўчанку, калі з яго нічога не было бачна. І відэа гэта даказала.

Следчыя не звярнулі ўвагу на словы Аляксандра Ларына, што свайго саўдзельніка па падрыхтоўцы тэракта «ён забіў і закапаў». Нібыта і не гаварыў ён нічога такога.

Для Мураўёвай крыху камічным выглядае эпізод з цацачным караблікам, які Аўтуховіч купіў у Маскве для дзіцячага конкурсу, а на судзе з яго спрабавалі зрабіць самаробнае выбуховае прыстасаванне. З гэтым караблікам Аўтуховіч, па словах Ларына, хацеў зрабіць замах на намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко.

Прадпрымальнік з Оршы Пузікаў на судзе адкрыта прызнаўся, што пасля дачы паказанняў следчы Клачко прэзентаваў яму бутэльку гарэлкі і квіток да Оршы. «Падчас справы мыназіралі вар'яцкі ціск на сведак», — кажа А.Мураўёва.

Людміла Гразнова з «Праваабарончага альянсу» кажа, што Аўтуховіч, Асіпенка і Казлоў — гэта «героі сённяшняга часу». «На судзе яны выступалі годна, чэсна, лагічна. Яны не выглядаюць падаўленымі і няшчаснымі. Нават пасля патрабаванняў пракурора яны паглядамі падбадзёрвалі прысутных у зале. На жаль, не ўсе яны такія. Ларын — гэта аб'ект для псіхааналітыкаў», — кажа Л.Гразнова.

Алеся Мураўёва не такая катэгарычная ў дачыненні да Ларына. Яна кажа, што гэты чалавек такая ж ахвяра сістэмы, як і іншыя падсудныя. І яшчэ невядома, які ціск давялося вытрымаць яму.

«Аўтуховіча па падпалах апрацоўвалі яшчэ ў 2005 годзе, але ніякіх доказаў віны не было. Ён выйшаў з турмы, але не супакоіўся. Цяпер яго вырашылі дабіць», — кажа Эніра Браніцкая з праваабарончага цэнтра «Салідарнасць».

«У Аўтуховіча былі моцныя апошнія словы. Ён гаварыў не пра сябе, а пра інтарэсы беларускага народа. Гэта дзяржаўны чалавек. Увесь працэс можна ахарактарызаваць словамі Юрыя Лявонава, які паўтараў увесь час: «Трызненне». Жывымі іх з турмы не выпусцяць, калі запрашваюць такія тэрміны», — працягвае Вячаслаў Сіўчык з руху «Разам».

«Відавочна, што справа палітычная. Няма сумневаў, што яны вязні сумлення. Буду рабіць усё, што ад мяне залежыць, каб гэтыя людзі апынуліся на свабодзе. Без салідарнасці перамагае зло», — зазначыў Аляксандр Мілінкевіч.

Толькі перад самым прысудам усё незалежнае грамадства прызнала, што справа Аўтуховіча палітычная.

**Зміцер Панкавец**

## Рада Еўропы прыпыніла кантакты з афіцыйным Мінскам

**на высокім узроўні. Адпаведная рэзалюцыя прынятая 29 красавіка большасцю галасоў на пасяджэнні ПАРЕ ў Страсбургу.**

У галасаванні ўзялі ўдзел 67 дэпутатаў, 58 з іх прагаласавалі за прыняцце рэзалюцыі, шэсць — супраць, тры ўстрымаліся (усяго ў ПАРЕ 318 дэпутатаў).

У рэзалюцыі ўказваецца на «недастатковы прагрэс» Беларусі ў галіне адпаведнасці стандартам Рады Еўропы. У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца, што ў краіне «ў атмасферы сакрэтнасці» былі прыведзены ў выкананне два смяротныя прыгаворы, калі скаргі асуджаных разглядаў Камітэт ААН па правах чалавека. Адзначаюцца таксама выпадкі парушэння ў Беларусі правоў польскай нацыянальнай меншасці і адсутнасць міжнародных назіральнікаў на выбарах у мясцовыя саветы.

Беларусь — адзіная краіна на кантыненце, якая не ўваходзіць у Раду Еўропы. На мінулай летняй сесіі ў Страсбургу было прынятае рашэнне, што нашай краіне будзе вернуты статус спецыяльна запрошанай у выпадку ўвядзення мараторыя на смяротнае пакаранне.

Тым не менш, з таго часу ў Беларусі па прысудах былі расстраляныя два чалавекі, што і выклікала вострую рэакцыю еўрапейскіх структур.

**ЗП**




**На заднім плане — галоўныя ідэолагі Лукашэнкі: былы, Алег Праляскоўскі, і сённяшні, Усевалад Янчэўскі.**

## Леанід Козік прапануе браць падатак з бяздзетных мужчын

**Працяг са старонкі 1.**

Пад ціскам крызісу размовы пра неабходнасць яго ўвядзення пачаліся ў Латвіі. Але да заканадаўчага акта прапановы не дайшлі.

Дарэчы, сам Леанід Козік падатак бы не плаціў. Мала таго, што галоўны прафсаюзнік ужо выйшаў на пенсію — яму 62 гады, дык і сям'я налічвае дваіх дзяцей, сына і дачку. Сын Андрэй праславіўся тым, што некалькі гадоў таму судзіўся з сайтам АГП.

Гэта далёка не першая абсурдная ідэя, агучаная прадстаўнікамі беларускай улады. Найбольшы розгалас атрымала прапанова дэпутата Сяргея Касцяна прымусова стэрылізаваць алкаголікаў і бамжоў. Астатнія смешныя ідэі фармуляваў іншы дэпутат, Васіль Хрол. На ягоным рахунку былі прапановы ўвесці падаткі на мабільныя тэлефоны і аўтамабілі.

**Яўген Васількоў**

## Сем сталічных школ набіраюць беларускамоўныя класы

**Набор у першыя класы пачнецца з 1 чэрвеня.**

Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

Гімназія №4 (вул. Кунцаўшчына, 18) прапануе навучанне ў фізіка-матэматычных, хіміка-біялагічных і філалагічных класах.

Даведка: e-mail: gymn4.minsk.edu.by, т.258-49-71, 258-49-74.

* * *

Гімназія №9 (вул.Сядых, 10) – вывучэнне ўсіх прадметаў па-беларуску, паглыбленае вывучэнне англійскай мовы, факультатыўнае – польскай. Прапануе вывучэнне прадметаў музычнага цыклу.

Даведка: т.283-04-21, 281-38-04.

* * *

Гімназія №23 (пр. Незалежнасці, 45) прапануе вывучэнне прадметаў па-беларуску, а таксама выкладанне на высокім узроўні англійскай, кітайскай, польскай моваў.

Даведка: e-mail: gymn23@minsk.edu.by; т.284-47-62, 284-87-16.

* * *

Гімназіі №28 (пр.Ракасоўскага, 93) прапануе выкладанне ўсіх прадметаў на роднай мове, а таксама паглыбленае вывучэнне французскай мовы, міжнародныя абмены, а таксама выкладанне прадметаў на французскай мове (краіназнаўства, літаратура Францыі) па праграмах, распрацаваных настаўнікамі школы.

Даведка: e-mail: sch2@minsk.edu.by.; т.248-32-02, 248-12-64.

* * *

Гімназія №14 (вул. Васняцова, 10) прапануе паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсаў па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы і шмат іншага. На базе гімназіі дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Даведка: т.295-01-33, 295-21-31.

***

СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19) — выкладанне на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе таксама бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведка: т. (017) 260-24-90; e-mail:sch190@minsk.edu.by

***

Школа №60 (вул.Лібкнехта, 82) — навучанне з музычным ухілам. У школе дзейнічаюць шматлікія гурткі, клубы, музей, творчыя і грамадскія аб'яднанні.

Даведка: 208-69-74, 209-94-49.

Да чытачоў. Дасылайце ў рэдакцыю інфармацыю пра беларускамоўнае навучанне ў вашым раёне. Пішыце пра новыя ініцыятывы бацькоў і ўпраўленняў адукацыі.

**Сямён Печанко**

## Сцісла

• **Прэзідэнцкія выбары восенню?** «Вядома, выбары было б зручней правесці да Новага года. Быў бы іншы настрой у грамадстве», — лічыць старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. Крайні тэрмін правядзення выбараў — 6 лютага 2011 года.

• **Кангрэс Ліберальна-дэмакратычнай партыі пройдзе летам 2010 года, паведаміў лідэр партыі Сяргей Гайдукевіч.** Паводле яго слоў, 30 сакавіка на імя кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея быў накіраваны ліст з просьбай дазволіць ЛДП арандаваць залу ў сталічным Палацы Рэспублікі для правядзення кангрэсу. У адказе Макей не сказаў ні так, ні не. На Кангрэсе Гайдукевіч будзе вылучаны на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах.

• **«Малады фронт», спроба №7.** З мэтай рэгістрацыі «МФ» мае намер правесці чарговы ўстаноўчы з'езд 29 мая. На з'езд будуць запрошаныя прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі.

**ЗП**

# Літва: аўтамабільнае шчасце працягваецца

**У аўтамабільнай Меццы паменшала машын, але засталіся прывабныя цэны.**

Аўтамабільны бум, выкліканы пагрозай росту мытаў, і не думае сціхаць. Па машыны ў Літву паехала калі не ўся краіна, то Гродзеншчына дакладна. На Астравеччыне ёсць двары, у якіх продажу чакаюць дзясяткі аўто. Руплівыя беларускія сяляне спадзяюцца, што расіяне неўзабаве ручаём пацякуць у Беларусь, каб прыдбаць недарагую іншамарку.

Інфармацыя, што з 1 ліпеня 2010 года мыта на патрыманыя машыны істотна ўзрасце, трывала ўбілася ў галаву беларусаў. Абвяржэннем пакуль веры не даюць. Хоць усё ідзе да таго, што сітуацыя застанецца ранейшай. Але ўсё роўна паездка па машыну ў Літву — магчымасць ашчадзіць тысячу еўра пры куплі. Згадзіцеся, добры стымул.



Прэстыжныя іншамаркі едуць ва Усходнюю Еўропу.

## Філіял Францыі на мапе Літвы

Аўтарынкаў у Літве багата: Каўнас, Марыямпаль, Таўраге, Гаруны, Клайпеда... Цяпер падрабязна пра Таўраге. Чаму мы адправіліся менавіта туды? Гарадок славіцца вялікім выбарам французскіх машын. Зразумела, хапае і «немцаў», але калі хочацца прыдбаць «Рэно», «Сітраен» ці «Пежо», то будуць задаволеныя жаданні любога купца.

Таўраге — гэта невялічкі горад на захадзе Літвы. Хоць ён горда называецца абласным цэнтрам, насельніцтва складае ўсяго 27 тысяч чалавек — тыповы беларускі райцэнтр. Побач знаходзіцца Калінінградская вобласць, непадалёк і Балтыйскае мора. Мяркуючы па колькасці машын, якія прадаюцца ў Таўраге, горад жыве за кошт аўтабізнэсу. Самае вялікае прадпрыемства за савецкімі часамі, мясакамбінат, даўно закрылася, а на фабрычных плошчах цяпер знаходзяцца станцыі тэхабслугоўвання.

Дабірацца да Таўраге лепш за ўсё на ўласным аўто. 220 км па трасе Вільня—Клайпеда, а пасля яшчэ 30 км да самога горада. Чым бліжэй да Таўраге, тым больш сустракаецца машын з беларускімі і французскімі нумарамі. Спадарожныя — беларусы, якія едуць па шчасце, сустрэчныя — шчаслівыя ўладальнікі новага-старога аўто.

Зрэшты, можна ехаць і на міжгароднім аўтобусе (каля 45 тысяч), але тады прыйдзецца ў самім Таўрагэ наймаць машыну, бо абысці ўсе стаянкі на сваіх на дваіх не ўяўляецца магчымым. Паслугі таксіста будуць каштаваць 100 тысяч на некалькі гадзін. Сярод плюсаў — за дадатковую плату кіроўца можа параіць нешта слушнае.

## Стаянкі, на якіх трымаецца горад

Калі ў Каўнасе ці іншых гарадах існуе адзін агромністы аўтарынак, то тут больш за 10 стаянак. Гэта і ёсць асаблівасць Таўраге. Раскіданыя па ўсім горадзе, яны працуюць па аднолькавым прынцыпе. Невялікая адгароджаная прастора, на якой стаяць 30—70 машын. На паперках пад лабавым шклом звычайна ўказваецца год выпуску машыны, цана і тэлефонны нумар прадаўца.

Званіць прыйдзецца шмат, таму варта на любой запраўцы набыць мясцовую сім-карту, тым больш што яе, у адрозненне ад Беларусі, можна купіць без доўгага афармлення дакументаў. Мы, напрыклад, куплялі Pildyk. 20 тысяч рублёў з запасам хапіла на некалькі дзясяткаў званкоў прадаўцам. Вядома, усе прадаўцы выдатна разумеюць расійскую мову.

Ключавое слова, з якога пачынаецца любы званок беларускіх купцоў: «Прахадная?» Маецца на ўвазе, ці трапляе аўто ў тэрмін дзесяцігадовай даўніны — на старыя машыны нашмат большае мыта. Рэч у тым, што на аўтамабілях напісаная дата пачатку эксплуатацыі. А мытнікаў будзе цікавіць трохі іншае — дата выпуску машыны.

«Непрахадная» — фактычна прысуд для аўто. Давялося бачыць, як на «Форд Фокус», які быў сабраны ў красавіку 2000 года, замест старога, перакрэсленага кошту 2800 еўра, стаяў новы — 2200 еўра. Вось такая цана аднамесячнай затрымкі. Вялікая ўдача — знайсці машыну, якая праз тыдзень-два стане непрахадной. Цана на яе ўжо ўпала да мінімуму.

## Законы рынку

Указаную на паперцы цану не варта ўспрымаць занадта сур'ёзна. Тое, што ўдасца скінуць як мінімум 100—150 еўра, — ледзь не навуковы факт. Можна паменшыць цану і на ўсе 400—500 еўра, калі мець добра падвешаны язык.

Таргавацца зручна ў два этапы. Спачатку па тэлефоне збіць цану да мяжы нахабства, а пасля, ужо пры сустрэчы, тыкаць прадаўца ў кожную знойдзеную хібу і патрабаваць зніжку яшчэ і яшчэ. У нашым выпадку ад пачатковай цаны «Рэно Сцэнік» у 2900 еўра аднялося 350 еўра, прытым што спачатку прадавец даводзіў, што цана апошняя і перагляду не падлягае.

«Нябітых машын на літоўскіх аўтарынках не бывае, — расказваў аўтаперагоншчык, які згадзіўся дапамагчы з выбарам. — Ёсць слаба бітыя і бітыя моцна». Калі пачытаць у інтэрнэце водгукі тых, хто нядаўна вярнуўся з Літвы, ахоплівае жах. А ёсць яшчэ і ілюстрацыі! Як фотаздымак з аўтавозам, дзе ўдала змясціліся рэшткі ад 14 розных машын. Аўтамабілісты, якія бачаць такую карціну, пачынаюць плакаць... Ці сапраўды на літоўскіх падпольных заводах днямі і начамі з дзвюх развалюх збіраюць адну машыну на хаду, сказаць складана. Скептыкі сцвярджаюць, што цана машын пасля такой ручной працы ўзрасла б у разы.

Рэальнасць больш-менш аптымістычная. Вядома ж, ёсць і развалюхі, месца якім у музеі дарожна-транспартным здарэнням. Але хапае і прыстойных з выгляду машын, самыя відавочныя хібы якіх ужо схаваныя.

Хаваць праблемы ўдаецца не заўсёды. На адной са стаянак з краю стаяла аўто, на 500 еўра таннейшае за рынкавую цану. Дата выпуску была пазначаная як май 2000 года, таму, у прынцыпе, машына была прыдатнай. Вось толькі калі прадавец завёў матор... Такую колькасць дыму можна ўбачыць хіба што пры паленні шын. Але і такая машына знойдзе ўдзячнага кліента. Замяніць матор — і ў Беларусі яна будзе прадавацца ўдвая даражэй, чым у Літве.

## Эвалюцыя цэнаў

Дзякуючы размовам з літоўскімі перагоншчыкамі, удалося прасачыць ланцужок росту цэн. Чаму ў Францыі патрыманае аўто — на прыкладзе папулярнага мінівэна «Рэно Сцэнік» — каштуе ўдвая танней, чым такая ж мадэль у Беларусі?

Напрыклад, зыходны кошт машыны ў Францыі — 1800 еўра.

**Прыблізныя выдаткі на дарогу:**
- Віза+страхоўка 65 еўра
- Страхоўка на машыну + паліва (ці аўтобусныя квіткі + паліва на адваротны шлях) 70 еўра
- Афармленне дакументаў (страхоўка і г.д.) 50 еўра
- Пражыванне 15 еўра
- Харчаванне 10 еўра
- «Сувеніры» літоўскім памежнікам 10 еўра

**Усяго 220 еўра**

Перагоншчык-літовец дадае да цаны яшчэ трацiну — плюс 600 еўра. Частка з гэтых грошай сапраўды траціцца на дастаўку, але як мінімум палова — проста ў кішэню. Перагоншчык-беларус купляе машыну ўжо за 2500 еўра. Яму трэба не толькі «адбіць» кошт візы і перавозкі аўто, але і аплаціць паслугі чалавека, на якога ўдасца аформіць дакументы. І ўзяць працэнт за рызыку. Менш чым тысячу еўра ён да цаны не дадасць. Вось і атрымліваецца, што для канчатковага карыстальніка машына даязджае за 3500 еўра — амаль $5000 даляраў у эквіваленце. Удвая даражэй, чым было на старце.

Дарэчы, дызельныя машыны даражэйшыя за бензінавыя аналагі ў сярэднім на 500 еўра.

«Беларусы вывезлі з Літвы, і адпаведна з Заходняй Еўропы, усё што змаглі. Раней я на сваім аўтавозе прывозіў у тыдзень 50 машын, цяпер збіраю максімум 10, — тлумачыць перагоншчык-прадавец. — Французы ўбачылі, што попыт узрос, і самі паднялі цэны».

Але літоўскія перагоншчыкі адназначна засталіся ў плюсе. За гарачыя паўгода яны выканалі сваю гадавую, а то і двухгадавую норму па продажах.

## Перавагі маленькага горада

Нам не пашчасціла — мы трапілі на аўтарынак 1 мая. Менавіта ў гэты дзень у Літве святкуецца гадавіна далучэння краіны да Еўрасаюза, таму тыя адзінкавыя ўстановы, што ўвогуле працавалі, зачыніліся апоўдні. А дакументы ж хочацца аформіць як мага хутчэй... Прадавец хуценька абтэлефаноўвае сваіх знаёмых у натарыяльных канторах і знаходзіць тую, якая згадзілася пад'ехаць у офіс у пазапрацоўны час. Усё ж невялічкія гарадкі, дзе ўсе адзін аднаму знаёмыя, маюць свае перавагі.

Сярод іншага — недарагое пражыванне. Нумар ва ўтульным мясцовым гатэлі на дваіх каштуе 55 тысяч. Сытны абед на двух абыдзецца яшчэ ў 45 тысяч. Калі не хочацца плаціць за сэрвіс, ніхто не замінае абысціся сухім пайком. Закупіцца ў маркетах Maxima нарэзаным мясам ці курыцай грыль — таксама прымальны бюджэтны варыянт.

## Непераможная карупцыя

Асалоду доўгай дарогі дадому могуць сапсаваць хіба што высокія цэны на паліва — амаль удвая даражэйшае, чым у Беларусі. Таму ашчадныя суайчыннікі стараюцца разлічыць, каб бензіну хапіла роўненька да мяжы і яшчэ на 10—15 км пра запас. А там ужо заліцца танным родным 92-м.

Другая праблема — карупцыя. Раздураныя беларускімі перагоншчыкамі, мясцовыя даішнікі і памежнікі нават не хаваюць, што настроеныя на хабар. Гэта на нашым баку мяжы перад кожным акенцам вісіць надпіс пра тое, што выпадкова і невыпадкова забытыя ў дакументах грошы будуць разумецца як спроба даць хабар. І адразу ж спасылка на адпаведны артыкул Крымінальнага кодэкса. У літоўцаў прасцей.

«Зразумела, што прыгнаныя з Францыі машыны будуць з французскімі нумарамі, — расказвае перагоншчык. — Па законе пасля пакупкі трэба замест іх паставіць літоўскія. Гэта каштуе 100 тысяч рублёў. Але нават калі па дарозе трапіцца паліцыя, яны возьмуць хабар усяго 50 тысяч». Як кажуць, эканомія навідавоку. «І не забудзьцеся на мяжы памежніку і мытніку 10 і 20 тысяч адпаведна, — працягвае ён. — Гэта такая слаўная традыцыя. Яны ўспрымаюць такую «дапамогу» як належнае і не чапляюцца да драбніц». Парада карысная, але вельмі псіхалагічна складаная для тых, хто не ўмее даваць хабар.

Шчыра кажучы, насамрэч літоўскі памежнік аказаўся іншым. На жаль, не ў тым плане, што катэгарычна адмовіўся ад любых грошай. Пахадзіўшы вакол машыны і чапляючыся да дробязяў па прынцыпе «не так ляціш, не так свісціш», ён параіў вяртацца ў Таўраге — між іншым, 250 км — па нейкую паперчыну. «Толькі ўлічвайце, што яе вам два дні будуць рабіць», — удакладніў мытнік. Пасля, пахадзіўшы вакол машыны, шэптам прапанаваў: «Ладна, 100 баксаў — і прапушчу. Пакладзіце ў свой багажнік, я адтуль забяру. Іначай ніяк».

**Яўген Васількоў**

# Беларуская эканоміка ўступіць у эпоху холдынгаў

**Два самыя каштоўныя створацца на аснове «Беларуськалія» і «Нафтана».**

Міністэрства эканомікі атрымала прапанову стварыць на базе РУП «ПА «Беларуськалій» холдынг па вытворчасці мінеральных угнаенняў. Мяркуецца, што ў склад холдынга ўвойдуць Гомельскі хімічны завод і рэгіянальныя ўпраўленні сельгасхіміі, якія займаюцца пастаўкай угнаенняў спажыўцам.

Яшчэ адзін холдынг — нафтахімічны — плануецца стварыць на базе наваполацкага «Нафтана». Ён будзе складацца з прадпрыемстваў «Гродна Азот», «Гродна Хімвалакно», «Магілёўхімвалакно» і «Завод горнага воску» (Пухавіцкі раён).

Не выключана, што ў гэты холдынг увойдзе таксама Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, дзе 48% акцый належыць расіянам.

У цэлым па рэспубліцы намер стварыць холдынгі выказалі ўжо каля 20 вытворчых аб'яднанняў і арганізацыйных структур.

Мяркуецца, што стварэнне холдынгаў дапаможа больш эфектыўна выкарыстоўваць прыбытак, а таксама атрымаць падатковыя палёгкі. Дзяржава спадзяецца вырашыць і яшчэ адна задачу — прыцягнуць замежных інвестараў.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Дапамога Грэцыі вырасце да 120 млрд еўра.** Пакет дапамогі Грэцыі будзе разлічаны на тры гады. Раней ЕС і МВФ абяцалі Грэцыі да 45 млрд еўра пад ільготны працэнт для пераадолення цяжкага бюджэтнага і даўгавога крызісу.

• **Беларусь збіраецца выпускаць кітайскія аўтамабілі.** Міністэрства эканомікі аднавіла перамовы з кітайскай кампаніяй Chery. Арыенціровачны кошт праекта складае каля $260 мільёнаў.

• **Цукру стане больш.** У Магілёўскай ці Гомельскай вобласці плануецца пабудаваць пяты цукровы завод. Грошы — каля 300 еўра мільёнаў — мае даць кітайскі інвестар.

• **«Крышталь» пераязджае.** Ужо ў ліпені пачнецца перанос лікёра-гарэлачнага завода «Крышталь» з цэнтра Мінска ў прамзону Калядзічы.

**ЯВ**

# Сціплы адпачынак коштам 200 тысяч еўра

**Аднак з юрыдычнага пункта гледжання Аляксандра Лукашэнку папракнуць няма ў чым.**

Адпачынак Аляксандра Лукашэнкі ў Альпах васьмігадовай даўніны аказаўся ў цэнтры карупцыйнага скандалу ў Аўстрыі. Бок, які запрашаў, аплаціў візіт праз сакрэтны рахунак, у абыход аўстрыйскіх законаў. Каштавала паездка Аляксандра Лукашэнкі 200 тысяч еўра. Цяпер справай займаецца аўстрыйская пракуратура.

На след гэтай гісторыі натрапіў аўстрыйскі журналіст і спартовы эксперт Эрвін Рот . На просьбу Рэдакцыі «НН» ён перадаў копіі некаторых квітанцый на аплату адпачынку Аляксандра Лукашэнкі ў 2002 годзе ў Альпах.

Матэрыялы цікавыя тым, што праліваюць святло на побыт беларускага кіраўніка на аўстрыйскім курорце Зээфельд. Пры ўважлівым разглядзе робіцца зразумела: адпачынак Аляксандра Лукашэнкі быў далёка не такім шыкоўным, як гэта падаецца на першы погляд.



Цёплая ўтульнасць гатэля Klosterbrau.

## Пяцізоркавы, сямейны

У пэўным сэнсе яго нават можна назваць досыць сціплым. Паводле рахунка з гатэля Kosterbrau, у ім пасялілася 17 чалавек беларускай дэлегацыі. Люкс, у якім жыў Лукашэнка, каштаваў больш за 700 еўра ў суткі.

Зрэшты, гэта цалкам адпавядае статусу госця. А вось астатнія ўдзельнікі дэлегацыі засяліліся ў звычайныя люксы. Пры гэтым палова людзей засялілася ў двухмясцовыя нумары. Сыны Аляксандра Лукашэнкі, як паказвае гатэльны рахунак, таксама спыніліся разам у двухмясцовым нумары.

Гатэльныя паслугі (бадай, сюды ўключана і харчаванне) склалі прыкладна 50 еўра ў дзень на чалавека — звычайны кошт вячэры ў добрай рэстарацыі.

Увогуле, гатэль Klosterbrau — хоць і даволі дарагі, пяцізоркавы, але далёка не элітарны. Хутчэй, ён арыентуецца на сямейны адпачынак. З водгукаў наведнікаў на сайце гатэля можна зрабіць выснову, што туды прыязджаюць у асноўным сямейныя пары, якія належаць да стабільнага аўстрыйскага сярэдняга класа. Вось толькі сярэдняга беларускага заробку на адпачынак усё-такі не хопіць. Цэны на пакоі ў гатэлі Klosterbrau складаюць на сёння (май 2010 года) ад 409 еўра за прэзідэнцкі люкс да 169 еўра за самы звычайны .

## Па адным і па двое

Згодна з рахункам з гасцініцы, з Лукашэнкам адпачывалі: Абельская (асабістая доктарка кіраўніка дзяржавы), Канаплёў (сябар маладосці Лукашэнкі, на той момант намеснік старшыні палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу, цяпер пазбаўлены дзяржаўных пасадаў), Жураўкова (тады кіраўніца справаў прэзідэнта, пазней будзе асуджаная за эканамічнае злачынства), Макей (тады памочнік прэзідэнта, цяпер — кіраўнік ягонай адміністрацыі), Пяткевіч (тады прэс-сакратарка прэзідэнта, цяпер намесніца кіраўніка адміністрацыі). Іх суправаджаў беларускі дыпламат у Аўстрыі, цяперашні пасол у Нямеччыне Андрэй Гіра. Жылі ў гатэлі таксама, імаверна, ахоўнікі — нехта Валерый Філіповіч і Кашпар (у адным нумары), наступныя пары — Андрэй Латышонак і Мікалай Уцюрын, Андрэй Карпянкоў і Мікалай Валчанскі (тут, верагодна, персанал гатэля пераблытаў імёны, таму што галоўнага ахоўніка прэзідэнта завуць Андрэй Уцюрын, а галоўнага «алмазаўца» — Мікалай Карпянкоў). Ледзь не самы танны нумар дастаўся сынам прэзідэнта. Яшчэ былі нехта Бабнёў і Наталля Нескрыенка — найхутчэй, што абслуга кіраўніка дзяржавы.

## Верталётам у бальніцу

З квітанцый вынікае, што Аляксандр Лукашэнка атрымаў невялікую траўму сцягна пры коўзанні на лыжах. Верталёт хуткай дапамогі перавёз яго ў мясцовую клініку. Такса за хвіліну палёту — 66 еўра, агулам машына налятала на 7260 еўра.

100 еўра каштаваў агляд доктара, 200 еўра — лічбавы рэнтген, 5 еўра плёнка для рэнтгена, магнітнарэзанансны здымак сцягна — 585 еўра. Наўрад ці беларускаму кіраўніку выставілі спецыяльна завышаны рахунак, хутчэй за ўсё, гэта стандартныя цэны на медыцынскія паслугі такога кшталту. Таму, калі раптам паедзеце на аўстрыйскі гарналыжны курорт, не забудзьцеся пра страхоўку — інакш дапамога доктара ўляціць вам у капеечку. Зрэшты, у выпадку Лукашэнкі такой праблемы не ўзнікла: медыцынскія выдаткі аплаціў аўстрыйскі бок.

## Празаічныя вытраты

Цалкам паездка прэзідэнцкай дэлегацыі на адпачынак у Аўстрыю каштавала каля 200 000 еўра. Вялікая агульная сума часткова вынікае са звычкі Аляксандра Лукашэнкі адпачываць вялікай кампаніяй, са сваякамі і прыбліжанымі.

Аднак асноўны кошт склалі, паводле звестак Эрвіна Рота, арэнда самалётаў для авіяпералётаў і арганізацыя дабрачыннага хакейнага турніру для дапамогі ахвярам Чарнобыля (усе выдаткі таксама аплаціў аўстрыйскі бок).

Абалонка таямнічасці вакол жыцця беларускага кіраўніка стварае прыдатную атмасферу для разнастайных плётак. Аднак яго побыт у гэтым канкрэтным выпадку выглядае нашмат больш празаічным, чым гэта часам малюе масавая фантазія. Эскапады расійскіх алігархаў у якім-небудзь Куршэвэлі выглядаюць непараўнана больш раскошнымі, чым адпачынак Лукашэнкі ў 2002 г. у Альпах.

З юрыдычнага пункту гледжання Аляксандра Лукашэнку папракнуць няма ў чым. Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аўстрыі запрасіў яго з сям'ёй на адпачынак — чаму б не з'ездзіць?

У беларускіх падаткаплатнікаў у гэтым выпадку таксама не павінна быць прэтэнзіяў — яны на канікулы прэзідэнта не патрацілі ні рубля (што цалкам пацвярджаюць квітанцыі). Улічваючы тое, што прэзідэнту, як ні круці, адпачываць трэба — выйшла нават значная эканомія.

Аднак з палітычнага пункту гледжання кіраўніку дзяржавы прымаць падарунак у выглядзе аплачанага адпачынку коштам 200 000 еўра — неэтычна і заганна.

## Небяспечныя сувязі

Паўстаюць пытанні наконт таго, якія матывы меў аўстрыйскі бок, калі вырашыў зрабіць такі больш чым шчодры падарунак.

Няма чаго дзівіцца, што аўстрыйскія арганізатары, а калі казаць больш дакладна — кампанія Casinos Austria, выявіліся не дужа сумленнымі гаспадарамі.

Афіцыйнае запрашэнне Аляксандру Лукашэнку было даслана ад імя тагачаснага прэзідэнта НАК Аўстрыі Леа Вальнэра, які адначасова з'яўляецца суўладальнікам буйной сеткі казіно Casinos Austria. Несумненна, беларускі бок здагадваўся пра тое, што спадар Вальнэр зацікаўлены не толькі ў спартовым супрацоўніцтве, але і ў тым, каб пашырыць свой бізнэс на Беларусь. Тым больш што Casinos Austria — гэта магутная кампанія, найбуйнейшы плацельшчык падаткаў у аўстрыйскую казну. Як праз 8 гадоў выявіла журналісцкае расследаванне, Леа Вальнэр вырашыў аплаціць адпачынак свайго госця праз сакрэтны рахунак, у абыход аўстрыйскіх законаў. Дарадцам беларускага прэзідэнта наўрад ці гэта было вядома, бо афіцыйна ўсе рахункі на аплату падарожжа выпісваліся на імя НАК Аўстрыі (каб пераканацца ў гэтым, дастаткова зірнуць на чэкі). І толькі Леа Вальнэр ведаў, што рахунак гэты — патаемны, і грошы на яго пераводзяцца з Casinos Austria...

**Алесь Кудрыцкі, Мікола Бугай**

З квітанцый вынікае, што Аляксандр Лукашэнка атрымаў невялікую траўму сцягна пры коўзанні на лыжах. Верталёт хуткай дапамогі перавёз яго ў мясцовую клініку. Такса за хвіліну палёту — 66 еўра, агулам машына налятала на 7260 еўра. 100 еўра каштаваў агляд доктара.

Люкс, у якім жыў Лукашэнка, каштаваў больш за 700 еўра ў суткі. Астатнія ўдзельнікі дэлегацыі засяліліся ў звычайныя люксы. Пры гэтым палова людзей засялілася ў двухмясцовыя нумары. Сыны Аляксандра Лукашэнкі таксама спыніліся разам у двухмясцовым нумары. Гатэльныя паслугі склалі прыкладна 50 еўра ў дзень на чалавека — звычайны кошт вячэры ў добрай рэстарацыі.

---

HOTEL KLOSTERBRÄU

Herr
Dir. Prof. Gerhard Skoff
Gusshausstrasse 6/7
A-1040 Wien

Seefeld, 22. März 2002

Sehr geehrter Herr Dir. Prof. Skoff!

Vorab möchten wir Ihnen unseren Dank zum Ausdruck bringen, dass Sie für den privaten Aufenthalt des Weissrussischen Präsidenten Aleksander Lukashenko unser Haus, nämlich das Hotel Klosterbräu in Seefeld, Tirol ausgewählt haben.

Mit grosser Freude, haben wir auch zur Kenntnis genommen, dass es Herrn Präsident Lukashenko aussergewöhnlich gut bei uns gefallen hat, was immer wieder durch Aussagen von Seiten der Weissrussischen Botschaft - Wien und von den Herren der Casinos Austria AG zum Ausdruck gebracht wurde. Selbstverständlich haben wir uns grösste Mühe gegeben, dass sich die gesamte Delegation in unserem Hause äusserst wohlfühlte.

Wir erlauben uns, Ihnen die Rechnung, in Form der Aufstellung unten zu Ihrer gefälligen Kenntnisnahme zu übermitteln und bitten Sie, sehr geehrter Herr Dir. Prof. Skoff, diese auf Vollständigkeit und Richtigkeit zu prüfen und dann an das „Olympische Komitee" in Wien zur Überweisung von € 47.632,74 weiterzuleiten.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| AR | 6426 | vom 09.3.2002 | € 307,30 | Gen. Dir. Dr. Wallner |
| AR | 6477 | vom 11.3.2002 | € 183,60 | Gen. Dir. Dr. Schenz |
| AR | 6667 | vom 17.3.2002 | € 12.019,03 | Paymaster Konto für Konsum. |
| AR | 6636 | vom 17.3.2002 | € 9.867,85 | Präsident Aleksander Lukashenko |
| AR | 6637 | vom 17.3.2002 | € 2.353,48 | Irina Abelskaja |
| AR | 6638 | vom 17.3.2002 | € 1.923,80 | Vladimir Konoplev |
| AR | 6639 | vom 17.3.2002 | € 1.590,50 | Galina Zhuravkova |
| AR | 6640 | vom 17.3.2002 | € 3.345,75 | Valery Filipovich/Kashpar |
| AR | 6641 | vom 17.3.2002 | € 1.605,50 | Vladimir Makei |
| AR | 6642 | vom 17.3.2002 | € 1.807,85 | Natalia Petkovitch |
| AR | 6643 | vom 17.3.2002 | € 3.510,52 | Andrei Latyshonok/Nikolai Vtyrin |
| AR | 6644 | vom 17.3.2002 | € 3.017,90 | Oleg Karpenkov/Nikolai Molchanski |
| AR | 6645 | vom 17.3.2002 | € 1.586,41 | Nathalie Neskrienko |
| AR | 6646 | vom 17.3.2002 | € 1.683,25 | Botschaftsrat Andrei Giro |
| AR | 6647 | vom 17.3.2002 | € 1.629,30 | Söhne von Präsident Lukashenko |
| AR | 6649 | vom 17.3.2002 | € 1.200,70 | Bobnev |

Die Rechnung für die Nächtigung von Herrn Gen. Dir. Dr. Wallner (nicht extra ausgewiesen) ist auf der AR 6667 verbucht.

464 130 109 – 00   20111 ERSTE

..2..

HOTEL KLOSTERBRÄU - FAMILIE SEYRLING - A-6100 SEEFELD
Tel. 05212-2621-0 - Fax 05212-3885 - e-mail: info@klosterbraeu.com
http://www.klosterbraeu.com
Seefeld 1200m Tirol

**Рахунак гатэля Klosterbrau за пражыванне беларускай дэлегацыі і прадстаўнікоў аўстрыйскага боку.**

Re.Datum 20.03.02

| Stück | Text | Einzelpreis EUR | Gesamtpreis EUR |
|---|---|---|---|
| | | | 0,00 |
| 1 | Verleiausrüstungen | 2.319,50 | 2.319,50 |
| | lt. Beileigenden | | 0,00 |
| | Verleihschein | | 0,00 |
| | | | 0,00 |
| 2 | Eishockey Sonderzeiten | 90,83 | 181,66 |
| | | | 0,00 |
| 7 | Langlaufausrüstungen | 54,16 | 379,12 |
| 7 | Langlaufausrüstungen | 74,16 | 519,12 |
| 10 | Langlaufhandschuhe | 24,75 | 247,50 |
| 2 | Eishockey Schläger | 49,16 | 98,32 |
| 2 | Langlaufski nicht Retour | 95,00 | 190,00 |
| 15 | Auserordentliche | 8,70 | 130,50 |
| | Arbeitsleistung | | 0,00 |
| | EURO | Nettobetrag | 4.065,72 |
| | EURO | 20% Ust | 813,14 |
| | EURO | Bruttobetrag | 4.878,86 |

Bankverbindung: Hypo Seefeld BLZ. 57000 Kont. 51011005300
Raika Seefeld BLZ. 36314
Kont. 200.584

**Квітанцыя за арэнду лыжнага і хакейнага рыштунку. Варта адзначыць, што рахунак выпісаны да аплаты на імя НАК Аўстрыі.**

CHIRURGIE & SPORT
SANATORIUM DR. SCHENK
GmbH
Diagnostik · Behandlung · Rehabilitation

Herrn
Lukaschenko Alexander
Karl Marx Str. 38
BY-220030 Belarus

PATNR.: 1010979
Geb.Dat.: 30.08.1954
Schruns, den 25.03.2002

**HONORARNOTE 148676**

Behandlungsdauer
08.03.2002 - 08.03.2002

| Datum | Leistung | Anzahl | Einzelbetrag | Betrag EUR |
|---|---|---|---|---|
| 08.03.2002 | Digitales Röntgen | 1 | 50,00 | 50,00 |
| | 1. Ordination | 1 | 100,00 | 100,00 |
| | Digitales Röntgen | 1 | 200,00 | 200,00 |
| | Röntgenfilm | 1 | 5,01 | 5,01 |
| | MRI Hüfte links | 1 | 585,01 | 585,01 |
| | intramuskuläre Injektion mit 2 Amp. Felden | 1 | 12,00 | 12,00 |
| | Bergung Notarzt-Helicopter (twin-engine) /Flugmin. | 110 | 66,00 | 7.260,00 |
| | Rechnungsendbetrag : | | EUR | 8.212,02 |

Diagnose: Dist. coxae sin.
Rupt. men. med. gen. sin. op.

Dr. Christian Schenk, FA für Unfallchirurgie - Wahlarzt

**Рахунак за тэрміновае медыцынскае абслугоўванне Аляксандра Лукашэнкі ў сувязі з атрыманай траўмай на лыжнай трасе ў Аўстрыі. Уключна з эвакуацыяй на верталёце.**

# «Пытать і вешать, вешать і пытать»

Прыхільнікі Савецкага Саюза адсвяткавалі Першамай.

1 траўня беларускія бальшавікі адсвяткавалі міжнародны дзень салідарнасці з працоўнымі. Сабраўшыся а 12-й ля Акадэміі Навук, яны прайшлі шэсцем на плошчу Бангалор, дзе адбыўся кароткі мітынг. Дэманстранты імкнуліся прыцягнуць да сябе ўвагу з дапамогай лозунгаў: «Буржуяў — на нары, рабочых — на Канары». Былі і больш радыкальныя, кшталту: «Нашы Мігі сядут в Ріге, нашы танкі снова в Праге!» ды «Пытать і вешать, вешать і пытать».

Удзельнікаў шэсця было няшмат — каля 60 чалавек. Яны выразна дзяліліся па ўзроставай прыкмеце. Узначальвала калону старая гвардыя з партрэтамі Леніна і Сталіна, чырвонымі расцяжкамі ды гармонікам, а замыкала маладая генерацыя — прадстаўнікі расійскай нацыянал-бальшавіцкай партыі.

Першыя па дарозе ў парк Дружбы народаў спявалі старыя савецкія песні, а нацболы разнастайнымі спосабамі імкнуліся прыцягнуць да сябе ўвагу мінакоў. Галоўным чынам з дапамогай лозунгаў: «Ададбраць і падзяліць!», «Бог казаў дзяліцца!». Былі і больш радыкальныя: «Мы маньякі, мы дакажам».

Падчас мітынгу на плошчы Бангалор выступоўцы крытыкавалі кантрактную сістэму і беззабароннасць працоўных перад наймальнікамі.

«Мы заклікаем свабодалюбныя народы паўстаць супраць амерыканскага імперыялізму», — заклікалі аратары.

Больш канкрэтным аказаўся выступ нацыянал-бальшавікоў. Яны выказалі сваю незадаволенасць палітыкай беларускіх уладаў, заявіўшы, што ў Беларусі «чалавек сёння — раб» і заклікалі да правядзення супольных дэманстрацый. «Толькі шматлюднымі акцыямі мы зможам дамагчыся ўплыву ў Беларусі», — скончыў свой выступ прадстаўнік беларускіх прыхільнікаў Эдуарда Лімонава.

Напрыканцы прысутныя аднагалосна прынялі рэзалюцыю аб салідарнасці усіх левых сіл Беларусі ў барацьбе з антычалавечным курсам і новым амерыканскім неафашысцкім рэжымам, асудзілі нежаданне мінскіх уладаў вярнуць у горад помнік Сталіну і раскрытыкавалі ідэю расійскіх уладаў правесці парад на Краснай плошчы супольна з прадстаўнікамі войскаў саюзнікаў у Другой сусветнай вайне.

«Адправім глабальны капіталізм на звалку! За сацыялістычную Беларусь! Ура, таварышы!» — крычалі бальшавікі, выклікаючы непрыхаваны смех у мінакоў.

**Алесь Пілецкі, фота Юліі Дарашкевіч**



«Мы маньякі, мы дакажам», — крычалі юнакі.




Нацболы заявілі, што ў Беларусі «чалавек сёння — раб».



Старая гвардыя з партрэтамі Леніна і Сталіна.

# Былы пасол Польшчы ў Беларусі — у цэнтры сямейна-шпіёнскага скандалу

Што павінен зрабіць дыпламат, каб спецслужбы прызналі яго нядольным годна рэпрэзентаваць сваю краіну?

У якім выпадку асабістае жыццё можа стаць прычынай пазбаўлення доступу да важнай дзяржаўнай інфармацыі? Гэтыя пытанні нечакана зманілі жыццё аднаго з творцаў беларускай палітыкі Польшчы — былога пасла ў Беларусі (1998—2002) і былога віцэ-дырэктара Усходняга дэпартамента польскага МЗС Марыюша Машкевіча.

Гісторыя пачалася яшчэ тады, калі Машкевіч кіраваў польскім дыпламатычным прадстаўніцтвам у Беларусі, піша газета «Жэчпасполіта». Пераехаўшы ў Мінск разам з жонкай і чатырма дзецьмі, ён неўзабаве кардынальна змяніў сваё жыццё, у якім з'явілася беларуска Кацярына. У выніку спадарыня Машкевіч з дзецьмі вярнулася ў Варшаву.

У савецкія часы такі рэзкі паварот у асабістым жыцці, безумоўна, адразу каштаваў бы дыпламату кар'еры, калі не горш. Сувязь дыпламата з замежнай грамадзянкай была выключаная. А тым больш з грамадзянкай краіны, якая знаходзіцца ў варожых адносінах з тваёй. Адная дэмакратыя на тое і дэмакратыя. Спадар Марыюш вярнуўся ў Польшчу пасля заканчэння свайго чатырохгадовага тэрміну і спачатку нават пайшоў на павышэнне па кар'ернай лесвіцы. Машкевіч меў вялікі ўплыў на фармаванне беларускай палітыкі Польшчы, а таксама на палітыку ЕС у дачыненні да нашай краіны.

Менавіта з ініцыятывы Машкевіча адбылася сустрэча міністра замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага з яго беларускім калегам Сяргеем Мартынавым у Белавежскай пушчы. Пасля чаго Польшча ўзяла курс на вывад Беларусі з ізаляцыі. Нават калі для таго прыходзілася заплюшчваць вочы на разгром Саюза палякаў і рэпрэсіі супраць беларускай апазіцыі.



Марыюш Машкевіч падчас арышту ў Мінску вясной 2006 г.

Польскія СМІ і кансерватары тады абвінавацілі Сікорскага ў «здачы» Саюза палякаў Беларусі ў імя палітычнай кан'юнктуры.

Толькі праз некаторы час газеты, радыё і тэлебачанне згадалі імя Марыюша Машкевіча ўжо з іншай нагоды — контрвыведка Польшчы пазбавіла яго доступу да важнай дзяржаўнай інфармацыі. Для дыпламата такога ўзроўню гэта азначае канец кар'еры. Прычым канец бясслаўны.

Якімі былі прычыны гэтага кроку польскіх спецслужбаў? Кампраметуючая сувязь з беларускай або правал палітыкі дыялогу з беларускімі ўладамі?

Калі Машкевіч стаў прэтэндэнтам на супрацоўніка Агенцтва ўнутранай бяспекі (ABW), у СМІ трапіла ягоная сямейная гісторыя. Аказваецца, беларуска, якую Машкевіч выдаваў за сваю жонку, была ягонай... мачахай. Паводле дакументаў, яна замуж за ягоным бацькам, а яе сын лічыцца па дакументах сынам бацькі Машкевіча.

Польскія спецслужбы палічылі, што такі незвычайны мар'яж мог даць беларускім спецслужбам магчымасць для шантажу. Ці ўжо даў? «Мы ніколі не прымаем рашэння па гіпатэтычных пагрозах, а заўжды грунтуемся на рэальным матэрыяле», — афіцыйна адказала на гэтае пытанне прэс-сакратара ABW.

Выглядае так, нібы былы пасол не хацеў адкрыта браць шлюб з замежніцай, каб не ставіць пад пагрозу сваю кар'еру. Але фіктыўны шлюб з мэтай атрымаць грамадзянства — гэта ўжо злачынства. А злачынства, у адрозненне ад кахання, не даруецца.

Польская контрвыведка дакладных каментароў у такіх справах не дае, спасылаючыся на інтарэсы дзяржавы. Незразумелым застаецца, ці беларускі КДБ мог уплываць на М.Машкевіча, ці, наадварот, спрычыніўся да завяршэння кар'еры дыпламата.

На апошняе намякае сам Машкевіч. Ён расказвае, што, калі ў сакавіку 2006 г. прыватна прыехаў у Мінск, каб узяць удзел у пратэстах на Плошчы, яго арыштавалі разам з іншымі ўдзельнікамі намётавага мястэчка. І ўжо на Акрэсціна чалавек у цывільным пасля допыту нагадаў на развітанне: «Мы цябе і ў тваёй Польшчы дастанем».

Зрэшты, таямніцы суправаджаюць любую справу, у якой замешаныя асобы такога ўзроўню. Тым больш, калі справа гэтая настолькі інтымная.

**АП**

## Сцісла

**• Украінскі міліцыянт застрэліў беларускага гангстэра.** Двое беларусаў спрабавалі абрабаваць ювелірную краму у горадзе Крывы Рог, звязаўшы прадавачку скотчам. Тая ў апошні момант паспела націснуць кнопку выкліку аховы. З'явілася міліцыя, рабаўнікі паспрабавалі забраць у яе зброю. У выніку аднаго з беларусаў застрэлілі, другі ўцёк. Але ў прыпаркаваным непадалёк мікрааўтобусе знайшліся іх дакументы. Яны ці то цёзкі па прозвішчы, ці то родныя браты.

**• Яна зняважыла, а ён забіў.** Труп жанчыны з 14 нажавымі раненнямі быў знойдзены на лесвічнай пляцоўцы 20-га паверха дома на вуліцы Лесі Украінкі. Падазраваны, 33-гадовы раней судзімы мінчук, пазнаёміўся з ахвярай у кампаніі сяброў і запрасіў яе да сябе дамоў. Па дарозе яна зняважыла мужчыну. Дык ён зацягнуў яе ў суседні са сваім дом і зарэзаў. Нож кінуў на месцы злачынства. Зараз следчыя высвятляюць, ці не датычны ён да яшчэ двух згвалтаванняў.

**• «Заяц» страляў у кантралёра.** У наваполацкім аўтобусе падчас праверкі праязных дакументаў маладая пара паказала кантралёру два непрабітыя квіткі. Кантралёр запатрабавала аплаціць штраф. У адказ малады чалавек дастаў пнеўматычны пісталет і закрычаў, што ўсіх перастраляе. Зрабіў стрэл у бок кіроўцы, уручную адчыніў дзверы і ўцёк з дзяўчынай. Міліцыя іх злавіла, «зайцу» за дурны выбрык пагражае да 10 гадоў турмы.

**• Рабаўнікі напалі на таксіста.** 25-гадовы кіроўца прыватнага таксі вёз ноччу двух пасажыраў. Каля вёскі Тарасава пад Мінскам яны паспрабавалі задушыць яго, накінуўшы на шыю пятлю. Аднак таксісту ўдалося выскачыць з машыны. Нападнікі ўцяклі на яго «Сітраене». Міліцыя схапіла іх у Дзяржынску. Аднаму 17, другому 18 гадоў.

**• Забіў і закапаў.** У Гродне раскрытае забойства 45-гадовай мясцовай жыхаркі, якая знікла колькі тыдняў таму. Міліцыя высніла, што 18 красавіка, падчас сваркі, жанчыну задушыў 31-гадовы былы муж.

**• Дзяўчына загінула з-за вожыка.** Трагедыя адбылася ўначы на аўтадарозе Маладзечна—Валожын паблізу вёскі Палачаны. На трасе на легкавым аўтамабілі ехала 19-гадовая дзяўчына, якая зусім нядаўна атрымала правы кіроўцы. Раптам на дарозе з'явіўся вожык. Дзяўчына рэзка затармазіла. Машына перакулілася, а пасажырка — аднагодка дзяўчыны — загінула. Калі б дзяўчына паспрабавала аб'ехаць вожыка ці раздушыла яго, усё было б інакш.

**СМ; БелаПАН, «Еўрарадыё»**

# «...Пайду з атрадам гарыбальдзійскіх партызан»

**Як раней нельга было пісаць пра злачынствы савецкіх партызанаў ці «асабістаў» у атрадах, так цяпер у пэўным асяродку «нямодна» згадваць злачынствы паліцаяў. Піша Віталь Тарас.**



**Партызанскі парад у Мінску. 1944 год.**

У маладосці мой бацька любіў спяваць з сябрамі. Ён не меў ні выдатнага музычнага слыху, ні голасу. Але гэта было абсалютна няважна.

Асабліва яму падабаліся, як мне запомнілася з дзяцінства, дзве песні пра вайну — польская «Чэрвонэ макі на Монтэ-Касіна» і італьянская «Бэла Чао» («Бывай, каханая»). Спявалася апошняя, здаецца, на дзвюх мовах. Памятаю радкі (прыводжу ў вольным перакладзе): «Я заўтра ўранку пайду з атрадам гарыбальдзійскіх партызан».

Пазней даведаўся, што, паводле легенды, напісаў яе адзін з партызанаў, якія змагаліся з фашыстамі ў Апенінскіх гарах.

Але яна настолькі зачароўвала, што я і цяпер выразна чую тую цудоўную мелодыю і прыпеў: «o bella ciao bella ciao bella ciao ciao ciao».

## Нетыповы

Не памятаю, каб у кампаніі бацькі спявалі савецкія ваенныя песні. Хоць амаль усе яго сябры ваявалі. Ніякіх «Ой, бярозы ды сосны...», а тым больш пахмутаўскіх «песень партызан». Фальш у той кампаніі адчувалі імгненна.

Бацька быў, канечне, нетыповым ветэранам. Ён пайшоў у партызанскі атрад, калі яму яшчэ не споўнілася 14, і запомніў вайну не такой, як большасць савецкіх ветэранаў. За ўсю вайну ён застрэліў толькі аднаго нямецкага салдата, выпадкова. Потым усё жыццё згадваў той эпізод — у тым ліку, у сваёй творчасці.

Ён ніколі не хадзіў на ветэранскія шэсці. Часам ездзіў толькі на сустрэчы партызанаў сваёй брыгады. Не чапляў і ўзнагароды на парадны пінжак, называў іх «цацкамі». (Хоць медалём «За адвагу», які атрымаў пасля вызвалення Мінска ў 1944-м, ганарыўся.)

І ў страшным сне не можна сабе ўявіць, каб ён падпісваў лісты супраць назвы сайта «Беларускі партызан» ці пікетаваў бы «Народную волю» за «плявузганне» на савецкіх партызанаў.

Наадварот, ветэраны самі неаднойчы пісалі на яго публічныя палітычныя даносы, абвінавачвалі ў прыніжэнні подзвігу савецкага народа. За «акопную праўду» бэсцілі і Васіля Быкава ды іншых пісьменнікаў-франтавікоў, з якімі бацька сябраваў.

Да праграмы «Песняроў», прысвечанай 40-годдзю Перамогі, «Праз усю вайну», бацька напісаў лібрэта, куды ўвайшлі песні на словы Міхаіла Кульчыцкага, Аляксандра Твардоўскага, Навума Кісліка. Напісаў і некалькі сваіх тэкстаў.

Адзін з іх («Какие вам нужны полотна? Триумф? Парад? Но горы трупов не бесплотны — они смердят») выклікаў шок.

Партыйнае начальства патрабавала зняць кампазіцыю, але Мулявін катэгарычна адмовіўся. Некаторыя песні з праграмы, стылізаваныя бацькам пад песні ваеннага часу — «Выпраўляла маці сына...», «Вяртанне», — надоўга сталі папулярнымі. Яны і дагэтуль гучаць на канцэртах, у беларускім тэле- і радыёэфіры. Праўда, далёка не заўжды называюць імя іх аўтара...

## Брыгады ці банды?

Публікацыя мемуараў Іллі Копыла «Нябышына. Вайна» ў газеце «Народная воля» — далёка не першая з тых, дзе апісваюцца злачынствы савецкіх атрадаў супраць мірнага насельніцтва Беларусі. Адмаўляць факты было б глупствам. Але ж як раней было немагчыма пісаць і казаць пра злачынствы савецкіх партызанаў ці «асабістаў» у атрадах, так цяпер у пэўным асяродку «нямодна» згадваць злачынствы паліцаяў, здзейсненыя ў супрацоўніцтве з гітлераўцамі. У некаторых аўтараў усе былыя паліцаі выглядаюць як ідэйныя патрыёты, што змагаліся за незалежнасць Бацькаўшчыны. У тым ліку — з ненавіснымі яўрэямі. Ну, а беларускія партызаны былі, адпаведна, спрэс бандытамі, сярод якіх не было ніводнага прыстойнага чалавека.

Мне падавалася, што гэта нейкая адметная асаблівасць савецка-беларускай ментальнасці. Але нядаўна трапіла ў рукі кніга Умберта Эка «Поўны назад! «Гарачыя войны» і папулізм у СМІ» (A passo di gambero: guerre calde e populismo mediatico). У кнігу ўвайшлі эсэ, якія публікаваліся на пачатку «нулявых» гадоў у газеце Espresso. У адным з іх, «Грамадзянскія войны, супраціў і тэрарызм», Эка закрануў тэму вайны ў Іраку, дзе войскі ЗША і кааліцыі сутыкнуліся з масавым супраціvам.

Умберта Эка піша:

«Значная частка тых, хто лічыць скандальным дзяліцца назвай «супраціву» з іракцамі, — гэта тыя, хто даўно імкнецца дэлегітымізаваць наш уласны Супраціў, сцвярджаючы, што партызаны былі бандытамі. «Супраціў» — тэрмін тэхнічны, да яго нельга ўжываць крытэры маральнай ацэнкі.

Ёсць і тэрмін «грамадзянская вайна» — гэта калі суайчыннікі, якія гавораць на адной мове, страляюць адно ў аднаго. Грамадзянскімі войнамі былі Вандэя і вайна ў Іспаніі, грамадзянскай вайной быў наш Супраціў (адны італьянцы ваявалі з іншымі італьянцамі). У нас, дарэчы, мелі месца адначасна і грамадзянская вайна, і супраціў, паколькі супраціvам завецца выступленне часткі грамадзянаў супраць замежнай інтэрвенцыі.

(...) Толькі ў рэдкіх выпадках грамадзянская вайна дасягае маштабу буйных палявых дзеянняў. Хоць у Іспаніі гэта было. Звычайна ў грамадзянскай вайне ўдзельнічаюць брыгады (інакш кажучы — банды). Яны налятаюць, наносяць удар і ўцякаюць. На фоне сутычак і закалотаў гуляюць на поўным раздоллі прыватныя арміі атаманаў, палявых камандзіраў, банды, якім проста на руку бязладдзе».

## Эпілог

Калі замяніць у тэксце Эка слова «супраціў» на больш звыклы нам тэрмін «партызанка», ён надзіва падыходзіць для апісання сітуацыі айчыннай гісторыі часоў Другой сусветнай вайны. Толькі не трэба казаць, быццам у нашых партызанскіх атрадах размаўлялі выключна па-расійску, а сярод паліцаяў — адно па-беларуску. У партызанах з розных прычынаў апынуліся не толькі «акружэнцы» ці гарадскія жыхары Беларусі, але шмат беларускіх сялян. А сярод калабарацыйных фармаванняў чаго вартыя расійцы-галаварэзы Гіль-Радзівонава.

Канечне, ні пра што падобнае мой бацька і яго сябры не думалі, калі спявалі песню пра «гарыбальдзійскіх партызан». Рамантызм гэтай песні не мае нічога супольнага з жорсткай рэальнасцю вайны. Але ў ёй ёсць — прынамсі, для мяне — нешта такое, што міжволі прымушае сэрца біцца хутчэй і ўзнімаць вышэй галаву.

Летась бацькі не стала. Мне здаецца — ён пайшоў з атрадам гарыбальдзійскіх партызан.

# Ад відэакамеры не схаваешся

Сэкс–скандал у Расіі.

У Расіі працягваецца серыя відэаскандалаў вакол дзеячаў апазіцыі і незалежных журналістаў. Гэтым разам у сеціва выклалі сцэны сэксуальнага характару.

У кадр трапілі сатырык Віктар Шандаровіч, старшыня «Другой России» Эдуард Лімонаў, лідэр барацьбітоў супраць нелегальнай іміграцыі Аляксандр Бялоў. Схаваная камера зняла іх за сэксам з маладой жанчынай. Адной і той жа. Раней з'явіліся ролікі з удзелам яе і некаторых іншых фігур расійскай апазіцыі.

«Героі» ролікаў прызналі сапраўднасць відэа.

Скандалы ў Расіі яшчэ раз нагадалі, што публічная асоба — ці то палітык, ці то вядомы журналіст — заўсёды «пад прыцэлам». І не толькі аб'ектываў усюдыісных папарацы, але і палітычных канкурэнтаў, а то і спецслужбаў. Тры гады таму кіраўнік Сусветнага банка Пол Вулфавіц трапіў у гісторыю ў Турцыі, дзе на ўваходзе ў мячэць яму давялося разуцца: тады ўвесь свет са здзіўленнем даведаўся, што ў кіраўніка магутнейшай фінансавай арганізацыі... дзіравыя шкарпэткі. То што тады казаць, калі вядомая асоба трапляе ў скандал, звязаны з наркотыкамі ці паслугамі прастытутак. Тым больш калі гаворка ідзе пра асобаў, якія прэтэндуюць на маральнае лідэрства ў сваім грамадстве. На Захадзе такія эпізоды робяцца заключнымі ў кар'еры палітыкаў.

Хочацца верыць, што лідэры беларускай апазіцыі не такія.

**Сямён Печанко**

# Гісторыя бульдогаў і насарогаў

Фельетон. Піша **Сяргей Мікулевіч**.

Намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір Фарыно выступіў на з'ездзе работнікаў адукацыі краін СНД у Астане з надзвычай своечасовай і карыснай ініцыятывай: стварыць адзіны падручнік па гісторыі для ўсіх краін СНД.

Безумоўна, гэта дазволіць прасачыць адзінства гістарычнага шляху Беларусі і Туркменістана, Казахстана і Украіны, Прыднястроўя і Паўднёвай Асецii.

Новыя гістарычныя абставіны патрабуюць удакладненай тэрміналогіі. Напрыклад, мангола-татарскае іга можна пераназваць у Першую расійска-казахскую дамову аб калектыўнай бяспецы, а знішчэнне Іванам Грозным Полацка — у далучэнне Беларусі да згаданай вышэй дамовы.

На жаль, у найноўшай гісторыі удакладненнем тэрміналогіі не згладзіш усіх вострых кутоў. Таму пры наяўнасці спрэчных момантаў можна абвяшчаць тэндэр з удзелам зацікаўленых бакоў. Напрыклад,

**Надзвычай карысная ініцыятыва: стварыць адзіны падручнік па гісторыі для ўсяго СНД.**

прыкры эпізод з пераваротам у Кыргызстане і звяржэннем законнага прэзідэнта Бакіева. Можна прапанаваць выкласці свае версіі кыргызскім гісторыкам і расійскім паліттэхнолагам. Бок, які пераможа, прафінансуе напісанне адпаведнага раздзела падручніка. Каб ні ў кога не ўзнікла сумневаў у аб'ектыўнасці, даручыць пісаць раздзел варта калектыву часопіса Адміністрацыі прэзідэнта «Беларуская думка». Як, зрэшты, гэтым надзейным спецыялістам можна даручыць пісаць усю кнігу.

Таксама ў межах праекта неабходна стварыць двухбаковыя пагаджальныя камісіі па спрэчных пытаннях беларуска-абхазскай, беларуска-узбекскай і г.д. гісторый. Фінансаваць іх можна з бюджэту саюзнай дзяржавы. Спатрэбіцца не менш за дзесяць выязных пасяджэнняў кожнай з такіх камісій. Узначаліць іх мог бы паважаны ва ўсім СНД пісьменнік і сенатар Мікалай Чаргінец.

А ў перспектыве чаму б не стварыць падручнікі па гісторыі дзяржаў-удзельніц АДКБ і Мытнага саюза?

# «Вынік выбараў вырашыцца на вуліцах»

Аляксандр Мілінкевіч распачаў прэзідэнцкую кампанію.

Перад тым як зрабіць адпаведную заяву для журналістаў, палітык наведаў праваслаўную царкву і каталіцкі касцёл. Добра, што храмы абедзвюх канфесій знаходзяцца побач з гатэлем «Еўропа», на сёмым паверсе якога і рабіўся старт кампаніі.

Перад уваходам у залу Аляксандр Мілінкевіч разам з жонкай Інай Кулей асабіста вітаў усіх гасцей. На экране тым часам дэманстраваліся фотакадры Мілінкевіча падчас мінулай прэзідэнцкай кампаніі, а таксама з сустрэч з вядомымі еўрапейскімі палітыкамі.

На прэзентацыю сабраўся калі не ўвесь, то значная частка апазіцыйнага палітычнага бамонду. Прыехалі актывісты з рэгіёнаў, што, пэўна, будуць узначальваць штабы Мілінкевіча. Нават лідэр кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў сядзеў дзесьці глыбока на камчатцы разам з філосафам Валянцінам Акудовічам.

У прэзідыуме ж Мілінкевіча акружалі ягоныя намеснікі. Па правую руку сядзеў Віктар Карняенка, па левую — Юрась Губарэвіч.

Менавіта Карняенка і абвясціў аб старце кампаніі Аляксандра Мілінкевіча. Ён у кампліментарнай форме пералічыў усе моцныя бакі кандыдата. «Гэтае рашэнне не ёсць нечаканым. Пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў Мілінкевіч заставаўся ў палітыцы. За гэты час ён правёў больш за 150 сустрэч у 70 гарадах краіны. Мала хто з айчынных палітыкаў мае такія поспехі ў еўрапейскіх краінах», — сказаў В.Карняенка.

Таксама ён нагадаў пра адукацыйную праграму імя Кастуся Каліноўскага як заслугу Мілінкевіча, іншыя праекты. «Гэта дзеяздольны палітык, які, акрамя жадання, мае яшчэ і досвед», — закончыў міні-прамову Карняенка.

«Я прыняў рашэнне балатавацца. Гэта вельмі адказнае рашэнне. Я не спяшаўся з ім. Але цяпер я адчуваю сілу, ёсць досвед, ёсць воля», — пачаў выступ Мілінкевіч.

Сваё рашэнне вылучацца ён абгрунтаваў адказнасцю перад сваімі продкамі, перад дзецьмі, а ў першую чаргу перад унучкай Марыйкай. «Яна мая найбольшая матывацыя. Я не хачу, каб Маша падышла да мяне са словамі: «Дзед, я хачу з'ехаць з краіны, бо не бачу тут перспектыў».

Мілінкевіч кажа, што ў ягоную каманду сабраны выдатныя людзі. І гэта не толькі апазіцыйныя актывісты, але ёсць і тыя, што працуюць ва ўладзе. «За пяць гадоў мы будзем у стане правесці асноўныя рэформы ў краіне», — зазначыў палітык.

Потым Мілінкевіч пачаў агучваць асноўныя тэзісы сваёй перадвыбарчай кампаніі. Найперш ён паабяцаў вярнуцца да канстытуцыі 1994 года, правесці дакладны падзел улады.

Эканамічныя рэформы Мілінкевіч прапануе рэалізоўваць на эстонскі манер. Даваць большую свабоду маладым эканамістам, палітыкам. Асноўнымі якасцямі беларусаў, якія дапамогуць гэта зрабіць, былі названыя працавітасць і адукаванасць.

Мілінкевіч выступае за ўступленне Беларусі ў ЕС. На ягоную думку, «мы можам увайсці хутка». Што да НАТО, то лепш заставацца нейтральнай краінай, лічыць палітык.

«У нас стратэгія толькі перамогі. Улада мусіць лічыць галасы разам з намі.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Калі гэтага не будзе, то вынік выбараў вырашыцца на вуліцы», — зазначыў А.Мілінкевіч.

Здалося, што прамова была крыху зацягнутай. Госці паспелі ўжо згубіць цікавасць да прамоўцы, а Мілінкевіч нечым нечаканым і вострым не мог вярнуць гэтую цікавасць. Гэта была роўная прамова аб усіх выгодах дэмакратыі, але «разынкі» ёй усё ж не хапала. Ніякіх уколаў і шпілек у адрас сваіх канкурэнтаў на выбарах не прагучала.

Калі ў Мілінкевіча запыталіся, на каго ён разлічвае, то пачулася ў адказ, што на Беларускі незалежніцкі блок. «Партыя БХД усё больш кажа, што нам не трэба ісці ў Еўропу, бо там не ўсё добра з маральнымі каштоўнасцямі. Гэта іх выбар, але трэба рабіць геапалітычны выбар», — адзначыў А.Мілінкевіч.

Палітык выступае за адзінага кандыдата, але калі ён насамрэч будзе найлепшым, а не так як было ў 2001 годзе. «Калі будзе лепшы кандыдат, то я гатовы стаць побач».

Абцякальным быў адказ Мілінкевіча на пытанне, з якой мэтай ён заклікае людзей на вуліцу: каб браць уладу сілавым шляхам ці проста паказаць, як нас шмат. «Перамагаць трэба ў галовах людзей, — пачаў палітык з рыторыкі, вядомай яшчэ з мінулай прэзідэнцкай кампаніі. — Людзі павінны перамагаць страх. Людзі выйдуць на вуліцы, каб прымусіць ЦВК правесці справядлівыя выбары».

Старт кампаніі быў дадзены досыць роўна. Праўда, нічога новага ад Мілінкевіча аўдыторыя не пачула. Але да выбараў застаецца яшчэ больш за паўгода.

**Зміцер Панкавец**

**Аляксандр Мілінкевіч**

нар. у 1947 у Гродне. У 1969 скончыў фізіка-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута. Працаваў настаўнікам. У 1972 скончыў аспірантуру Інстытута фізікі АН БССР. Стажыраваўся ва ўніверсітэце Манпелье (Францыя, 1980). У 1980—1984 кіраваў кафедрай Сеціфскага ўніверсітэта (Алжыр); быў дацэнтам Гродзенскага ўніверсітэта (1984—1990); намеснікам старшыні Гарадзенскага гарвыканкама. Валодае французскай і польскай мовамі. У 2006 — кандыдат у прэзідэнты Беларусі ад Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Па афіцыйных лічбах, набраў больш за 6%, паводле незалежных сацыялагічных апытанняў — 18%. Лаўрэат прэміі Еўрапарламента «За свабоду думкі» ім. Сахарава. Лідэр Руху «За Свабоду».

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Аляксандра Мілінкевіча

Лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч стаў пятым апазіцыйным палітыкам, які абвясціў аб сваім удзеле ў прэзідэнцкіх выбарах. Якія моцныя і слабыя бакі гэтых кандыдатаў? «НН» працягвае цыкл «5+5–»

### 1. Досвед

**+** Мілінкевіч можа стаць першым апазіцыйным палітыкам, які будзе ўдзельнічаць у двух выбарах запар. Ён не зламаўся пасля кампаніі 2006 года, застаўся ў палітыцы. Гэта выгодна адрознівае яго ад Домаша і Ганчарыка. Калі ўдасца добра ўсё прааналізаваць, то сёлетнюю кампанію Мілінкевіч ужо будзе рабіць з улікам памылак і хібаў мінулай. Апроч выбарчага досведу, Мілінкевіч мае і досвед кіраўніка. У свой час ён з'яўляўся намеснікам старшыні Гродзенскага гарвыканкама. Праўда, ужо доўгі час ён з'яўляецца афіцыйна беспрацоўным.

**–** Досвед паразы. Можна доўга гаварыць, што выбары былі сфальшаванымі, што гэта ўвогуле не былі выбары, але за Мілінкевічам цягнецца шлейф паразы з мінулай кампаніі. А калі ўзгадаць, то і з домашаўскай таксама, калі Мілінкевіч быў кіраўніком штаба кандыдата. Пры гэтым, за ягонай спінай стаіць моладзь, якая такога сумнага досведу яшчэ не мела. Зрэшты, у спорце часта так здараецца, што паразы спараджаюць здаровую злосць і прагу рэваншу. У свой час Мілінкевіч быў чэмпіёнам БССР па баскетболе.

### 2. Вядомасць

**+** Мілінкевіч застаецца самым вядомым апазіцыйным палітыкам з найвышэйшым рэйтынгам. Гэта заслуга тых выбараў. Важным было тую вядомасць і пазнавальнасць не разгубіць. З гэтай мэтай палітык працягвае ездзіць па краіне, сустракацца з людзьмі. Мілінкевіч увесь гэты паміжвыбарны час заставаўся адзіным палітыкам, што рэгулярна ездзіў у рэгіёны.

**–** Узрост. Мілінкевіч ужо тры гады як пенсіянер. Асабліва мінусам гэта выглядае, калі ўлічыць, што канкурэнты па апазіцыйным лагеры маладзейшыя на дзесяць, а то і на 25 гадоў. Адамкуса ў Літве абралі калі яму было ўжо больш за 70 гадоў, але ў нас не Літва з яе дэмакратычнымі працэдурамі. Здароўе ў лідэра Руху «За Свабоду» таксама ўжо не як у маладосці. Летась палітык перанёс аперацыю, а потым цэлае лета быў вымушаны праходзіць рэабілітацыю ў родных Берштах.

### 3. Інтэлігент

**+** У адрозненне ад многіх іншых апазіцыянераў, Мілінкевіч мае выразны архетып, гэта вобраз «кандыдата-інтэлігента». Ён нібыта ўвасабляе сабой еўрапейскі выбар беларусаў. Заўсёды элегантны, прыстойны, вытрыманы. Гэтым Мілінкевіч прываблівае многіх выбарцаў. Часта гаворыцца, што, каб перамагчы Лукашэнку, патрэбная абсалютна процілеглая спакойная сіла. І Мілінкевіч найлепш падыходзіць пад гэтыя крытэры.

**–** Нерашучасць. Ад савецкага інтэлігента ў Мілінкевіча засталася нерашучасць. Ён доўга абдумвае свае рашэнні, яны яму даюцца цяжка. Прыняць спантаннае яркае рашэнне — гэта не пра Мілінкевіча. У экстрэмальных сітуацыях палітык часта губляецца і не ведае, які варыянт развіцця падзей будзе правільным. Разам з тым, палітык умее трымаць удар, што ўжо неаднаразова даказваў.

### 4. Праграма

**+** Яшчэ за дзевяць месяцаў да выбараў Мілінкевіч прэзентаваў тэзісы сваёй перадвыбарчай кампаніі. Менавіта з ёй палітык будзе грукацца да сэрцаў выбарцаў. Нічога асабліва новага ў ёй няма, але хто сказаў, што мусіць быць? Перадвыбарчыя праграмы падобныя ва ўсім свеце. Мілінкевіч ужо ведае, з чым ён пойдзе на выбары, іншыя — яшчэ не.

**–** Адсутнасць харызмы. У апазіцыйных актывістаў нарастае расчараванне праз шматгадовае безвыніковае змаганне з дыктатурай. І каб перамагчы гэтую паняверку, яны хацелі б пабачыць моцнага лідэра, які дасць надзею на перамогу. Патрэбен драйв, у Мілінкевіча яго няма. Рыторыка амаль не змянілася з часу мінулай кампаніі. Падчас ягонага выступу на прэзентацыі цягнула на сон, а на пытанні ён пачынаў адказваць так здалёку і абцякальна, што некаторыя паспявалі забыцца, пра што пыталіся.

### 5. Падтрымка

**+** З усіх апазіцыянераў Мілінкевіч мае найбольшае прызнанне за межамі Беларусі. За апошнія пяць гадоў ён заставаўся тварам беларускай апазіцыі на Захадзе. Праводзіў дзясяткі сустрэч з еўрапейскімі кіраўнікамі, парламентарамі, маральнымі аўтарытэтамі.

**–** Адсутнасць кансалідацыі ў апазіцыі. Па ўсім выглядае, што апазіцыйныя сілы пойдуць на выбары шматлікімі калонамі (Мілінкевіч, Міхалевіч, Рымашэўскі, Саннікаў, Някляеў...). Актывісты ў такой сітуацыі не ведаюць, на каго будуць працаваць. Каманда Міхалевіча будзе здольная перацягнуць частку старой гвардыі Мілінкевіча. Някляеў масава перабраў да сябе рэгіянальны актыў. Самым жа крыўдным будзе, калі ніводзін з гэтых кандыдатаў так і не зможа сабраць 100 тысяч подпісаў.

**Зміцер Панкавец**




СЯМЁН ПЕЧАНКА

КАМЕНТАР

## Аляксандар Класкоўскі: Якія шанцы?

Можна сказаць, што зараз ужо сапраўды распачынаецца передвыбарчая кампанія. Таму што Мілінкевіч усё-такі самая раскручаная фігура з тытульных апазіцыянераў. І, натуральна, чакалася ягонае ўступленне ў гульню.

Калі ставіць пытанне рубам: якія шанцы? Па-першае, пры ўсіх сваіх звадках, апазіцыйныя сілы згодныя наконт таго, што ў краіне няма выбараў у прынцыпе. Другі момант: народ апалітычны. Народ пасіўны, гэта пацвярджае незалежная сацыялогія. І таму самае вялікае пытанне выклікае сама формула стратэгіі Мілінкевіча: «Або мы прымусім улады, каб яны сумленна лічылі галасы, або – вуліца». Але ці ўдасца вуліца пры сённяшнім стане беларускага грамадства?

Сапраўды, тэарэтычна – і гэта зноў паказваюць апытанні — многія хацелі б новага чалавека. Змены вісяць у паветры. Але, з іншага боку, грамадства цяпер сапраўды не ў тым стане, каб ісці і абараняць свой выбар. Вось гэта вялікая праблема для беларускага грамадства і для любога апазіцыйнага кандыдата — ці гэта Мілінкевіч, ці любы іншы.

# Зробім Беларусь сапраўднай Еўропай

Тэзісы да перадвыбарчай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча.

Беларусы заслужылі права жыць лепей, больш заможна і вольна. Што гэтаму перашкаджае? Тое, што кіраўніцтва, абвяшчаючы дзяржаву для народа, на самай справе пабудавала дзяржаву для сябе.

Гэта ненармальна. І мы, каманда Аляксандра Мілінкевіча, ведаем, як змяніць сітуацыю без хаосу, рэвалюцыяў і шокавай тэрапіі. Мы маем план пераўтварэнняў, каб за пяць гадоў беларусы наблізіліся да еўрапейскага ўзроўню жыцця. Нацыя, што так многа пакутавала, заслужыла права людзьмі звацца.

Сённяшняе месца і роля Беларусі ў свеце не адпавядае яе магчымасцям, патэнцыялу і нацыянальным інтарэсам. Галоўныя прычыны таму — непаслядоўная і бессістэмная палітыка цяперашняга кіраўніцтва краіны (…).

Досвед нашых суседзяў паказвае, што нягледзячы на ўсе складанасці і праблемы, еўрапейская інтэграцыя і для беларусаў ёсць адзіным перспектыўным шляхам. Таму мы выступаем за збліжэнне з аб'яднанай Еўропай, якое паспрыяе росквіту нашай краіны і рэалізацыі яе багатага чалавечага патэнцыялу, гарантуе дзяржаўную незалежнасць і захаванне нацыянальнай самабытнасці.

## I. Адказная ўлада — справядлівае грамадства

Дзяржава мусіць служыць кожнаму з нас, а не чыноўнікам. Трэба сапраўды зрабіць іх слугамі народа. Дзеля гэтага — вярнуць дэмакратыю і найперш нармальныя выбары і сапраўднае мясцовае самакіраванне ў адпаведнасці з Еўрапейскай хартыяй.

Мы адновім дэмакратычныя прынцыпы падзелу ўлады, замацаваныя ў Канстытуцыі 1994 г., і правядзем выбары ва ўсе органы ўлады па міжнародных дэмакратычных стандартах.

Эфектыўная абарона правоў грамадзян немагчыма без справядлівых, незалежных і непрадузятых судоў. Суды не павінны быць залежнымі ад выканаўчай улады і будуць выведзены з-пад яе палітычнага, фінансавага, адміністрацыйнага ўплыву. Грамадзяне атрымаюць права непасрэдна абіраць і адклікаць суддзяў. Мы забяспечым роўную магчымасць для ўсіх жыхароў краіны звяртацца ў судовыя інстанцыі і зробім даступнымі адвакацкія паслугі.

Справядлівае грамадства таксама немагчыма без свабоды слова. (…).

Будзе ліквідавана дзяржаўная манаполія на СМІ і дыскрымінацыйны парадак акрэдытацыі журналістаў. (…).

Будуць адмененымі ўсе дыскрымінацыйныя законы і іншыя нарматыўныя акты, якія перашкаджаюць дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў, парушаюць правы нацыянальных і рэлігійных меншасцяў. (…).

## II. Эканоміка

**Эканамічны рост для ўсіх.** Беларусь здольная падтрымліваць штогадовыя тэмпы эканамічнага росту на ўзроўні 7–10% нават пры поўным пераходзе на рынкавыя кошты на нафту і газ пры ўмове, калі ў яе эканоміку будзе прыцягвацца да 10 мільярдаў прамых замежных інвестыцый у год.

(...)

Пры гэтым мы будзем асцярожна ставіцца да прыватызацыі стратэгічна важных прадпрыемстваў, транзітнай інфраструктуры і іншых сістэмаў жыццезабеспячэння. Мы захаваем гэтыя аб'екты ў руках дзяржавы да таго часу, пакуль не будуць створаны ўмовы для іх прыватызацыі без шкоды нацыянальным інтарэсам і дабрабыту грамадзян.

Права прыватнай ўласнасці на зямлю павінна быць заканадаўча замацавана і непахісна абараняцца дзяржавай.

**Гарантуем празрысты бюджэт.** (…) Мы замацуем за адукацыяй і аховай здароўя статус прыярытэтных накірункаў бюджэтнай палітыкі. Забяспечым стабільнасць дзяржаўных фінансаў праз спыненне непатрэбных дзяржаўных выдаткаў і інвестыцыяў у аб'екты, якімі амаль не карыстаюцца простыя людзі. Мы правядзем падатковую рэформу (…). Мы прымем закон пра бюджэтную адкрытасць і забяспечым, каб кожны грамадзянін Беларусі мог ведаць, куды ідуць грошы падаткаплацельшчыка.

**Падтрымаем прыватны бізнес.** Развіццё прыватнага бізнесу — аснова эканамічнага дабрабыту любой сучаснай дзяржавы. (…)

**Выкарыстаем транзітны патэнцыял.** Выгоднае геаграфічнае становішча Беларусі сёння слаба працуе на эканоміку краіны. Цяперашняе кіраўніцтва стварыла такія ўмовы для транзітных таварных плыняў, што замежныя грузаперавозчыкі аб'язджаюць нашу краіну вакольнымі шляхамі. Амаль штогод адбываюцца энергетычныя войны з Расіяй, што пагражаюць транзіту энерганосьбітаў у краіны ЕС. Наша задача — палепшыць імідж Беларусі як надзейнага і адказнага транзіцёра (…).

**Замест АЭС — энергазберажэнне.** Мы адмовімся ад планаў будаўніцтва Беларускай АЭС і інвестуем ашчаджаныя грошы ў мадэрнізацыю існуючых магутнасцяў па генерацыі цеплавой і электрычнай энергіі. Пры павелічэнні эфектыўнасці існуючых магутнасцяў у 1,5–2 разы мы зэканомім колькасць энергіі, на выпрацоўку якой спатрэбяцца магутнасці двух ядзерных рэактараў.

Мы зробім падвышэнне энергаэфектыўнасці жытла беларускіх грамадзянаў прыярытэтам інвестыцыйнай палітыкі і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі (ЕС, Сусветны Банк). Буйныя інвестыцыі ў энергазберажэнне на аснове сучасных тэхналогіяў дазволяць скараціць спажыванне энерганосьбітаў на 1 кв.м жылой плошчы ў 2–3 разы, што аўтаматычна абернецца меншымі выдаткамі для грамадзянаў.

Мы будзем максімальна заахвочваць інвеставанне ў правераныя практыкай альтэрнатыўныя крыніцы энергіі (біягаз, біямаса, энергія ветру) і энергазберагальныя тэхналогіі. Мы мабілізуем прыцягненне ў краіну еўрапейскага досведу развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі. У выніку спалучэння захадаў па энергаэфектыўнасці і развіцці альтэрнатыўных крыніцаў энергіі Беларусь ужо ў бліжэйшы час зможа істотна знізіць сваю залежнасць ад нафты і газу.

**Эфектыўная сельская гаспадарка.** У падтрымцы аграрнага сектара трэба перайсці ад кампанейшчыны (...) да доўгатэрміновага крэдытавання ўсіх вытворцаў сельгаспрадукцыі, незалежна ад формы ўласнасці, пад поўны тэхналагічны цыкл. Будуць створаны спрыяльныя ўмовы для шырокага выхаду беларускіх сельгасвытворцаў на еўрапейскія рынкі. Такім чынам мы зэканомім велізарныя грошы, якія зараз пераліваюцца ў неэфектыўны аграрны сектар, і створым умовы для ўмацавання прыбытковых прадпрыемстваў і стварэнне фермерскіх гаспадарак.

## III. Сацыяльная палітыка

Дзяржава павінна гарантаваць годны ўзровень жыцця людзям, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, ветэранам, удзельнікам ваенных канфліктаў і іншым катэгорыям грамадзянаў, якія маюць заслугі перад краінай. Мы вернемся да пытання пра сацыяльныя ільготы для школьнікаў, студэнтаў, пенсіянераў і іншых сацыяльна неабароненых груп грамадзянаў.

(...)

**Дамо беларускай моладзі еўрапейскую адукацыю!** Сучасная канкурэнтаздольная эканоміка вымагае бізнес-асяродка, спрыяльнага для інавацыяў, сучаснай сістэмы адукацыі і навукі, кваліфікаванай працоўнай сілы. Мы скароцім або цалкам скасуем падаткі на прыбыткі, што будуць інвеставацца ў мадэрнізацыю вытворчасці і прыцягванне сучасных тэхналогій.

Створым у Беларусі сучасную еўрапейскую сістэму бізнес-адукацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Мы скасуем усе абмежаванні на міжнародныя кантакты беларускіх ВНУ, выкладчыкаў і студэнтаў і будзем заахвочваць стажыроўкі, абмены і сумесныя праекты для прыцягвання ў Беларусь сучасных ведаў і тэхналогіяў. Прымусовае размеркаванне студэнтаў будзе заменена на права выбару першага працоўнага месца. Спынім камерцыялізацыю адукацыі.

(…)

Далучым Беларусь да Балонскага працэсу — агульнаеўрапейскай праграмы ўніфікацыі адукацыйных стандартаў, да якой ужо далучыліся ўсе суседзі Беларусі ўключна з Расіяй. Гэта падвысіць узровень універсітэцкай адукацыі, дазволіць беларускім студэнтам вучыцца ў любых еўрапейскіх ВНУ, а выкладчыкам — праходзіць стажыроўкі ў еўрапейскіх навуковых цэнтрах. Мы забяспечым міжнароднае прызнанне беларускіх дыпломаў у ЕС, а еўрапейскіх — у Беларусі (…).

Якасная вышэйшая адукацыя немагчымая без якаснай сярэдняй школы. Будзе падвышаны прэстыж прафесіі настаўніка і выкладчыка праз падвышэнне заробкаў і паляпшэнне матэрыяльнай базы (…).

**Рэформа жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** Будзе праведзена паслядоўнае рэфармаванне сістэмы ЖКГ на аснове лепшага еўрапейскага досведу. Мы здзейснім пераход ад дзяржаўнай манаполіі на абслугоўванне жыллёвага фонду да стварэння канкурэнтаздольных прыватных абслугоўваючых кампаніяў, таварыстваў уласнікаў і іншых прадпрыемстваў з мэтай паляпшэння якасці паслуг і зніжэння выдаткаў на ўтрыманне жылога фонду.

**Даступная медыцына.** Сістэма аховы здароўя будзе ўпарадкавана такім чынам, каб яна была даступная для ўсіх катэгорыяў грамадзян. Не варта рабіць перашкодаў для развіцця прыватнай медыцыны, але ў ёй павінна існаваць канкурэнцыя; людзі будуць мець магчымасць абіраць, дзе і ў каго ім атрымліваць медыцынскія паслугі. Аднак дзяржава будзе кантраляваць цэны і якасць паслуг у гэтай сферы.

Мы будзем развіваць таксама страхавую медыцыну, карыстаючыся найлепшым замежным досведам.

**Паклапоцімся пра пенсіі сёння.** Будзем паступова ажыццяўляць пераход да назапашвальнай сістэмы пенсійнага забеспячэння, бо зараз пенсіянераў утрымлівае працуючае насельніцтва, але яно з кожным годам скарачаецца. Таму, каб нашы дзеці і ўнукі мелі пенсійнае забеспячэнне, нам трэба своечасова паклапаціцца аб правядзенні пенсійнай рэформы.

## IV. Замежная палітыка

Фундаментам і першачарговым прыярытэтам замежнай палітыкі з'яўляюцца нацыянальныя інтарэсы і іх паслядоўнае адстойванне. Пастаяннае лавіраванне паміж Захадам і Усходам і кан'юнктурны гандаль знешнепалітычнай арыентацыяй павінны адысці ў мінулае.

**За еўрапейскую інтэграцыю.** Стратэгічная мэта — поўная інтэграцыя Беларусі ў Еўрапейскі Саюз. (…)

**За добрасуседскія адносіны з Расіяй.** Беларусь і Расія як дзве незалежныя дзяржавы павінны мець добрасуседскія і ўзаемавыгадныя адносіны. Яны будуць засноўвацца на здаровым прагматызме і ўзаемнай павазе нацыянальных інтарэсаў нашых краін. (…)

**Беларусь — нейтральная дзяржава.** Мы бачым Беларусь нейтральнай дзяржавай і выступаем за выхад краіны з ваенных блокаў і недалучэнне да іх у будучым. (…)

*Гэты дакумент з'яўляецца працоўным варыянтам праграмных тэзісаў, якія будуць дапаўняцца шляхам атрымання зваротнай сувязі ад грамадзянаў, экспертаў, спецыялістаў-практыкаў і актывістаў кампаніі.*

# Няўжо мала?

**Уладзімір Колас** адказвае Барысу Тумару (гл. «Неінтэлігентная гульня Рады інтэлігенцыі», №16).

Думаю, не варта цяпер губляць час на доказы неабходнасці кансалідацыі намаганняў дэмакратычнай часткі грамадства. Відавочна, што без іх гаварыць пра перамогу на будучых прэзідэнцкіх выбарах, а таксама кантроль за выбарамі і абарону сапраўдных вынікаў, немагчыма. Гэта яшчэ раз пацвердзілі «вынікі» мясцовых «выбараў».

Як гэтай кансалідацыі дасягнуць? Можна сядзець і чакаць, калі яна адбудзецца сама. Можна зларадна паціраць рукі і, чакаючы, калі ўсё ляснецца чарговы раз, зліваць свае негатыўныя эмоцыі ў інтэрнэт ці ў газеты, якія пагодзяцца выдзеліць для гэтага свае старонкі. А можна спрыяць дасягненню кансалідацыі. Рада інтэлігенцыі абрала апошні варыянт. З вясны мінулага года мы пачалі сустрэчы з лідэрамі партый і рухаў. Потым, на прапанову АДС, увайшлі ў групу па выпрацоўцы працэдуры выхаду на «адзінага» кандыдата. Амерыканская мадэль «праймэрыз», якая была прапанаваная ў якасці такой працэдуры, выклікала нашую крытыку.

Такія мадэлі паспяхова працуюць у дэмакратычных грамадствах, дзе людзі пакаленнямі выхоўваюцца ва ўмовах вяршэнства закону, свабоды слова, незаангажаванасці СМІ. Але капіяваць іх у Беларусі, дзе ўсе названыя ўмовы сёння існуюць з дакладнасцю да наадварот, — справа, на наш погляд, марная. І тое, што наладзіць «праймэрыз» так і не ўдалося, пацвярджае гэтую аксіёму. Але не вырашае праблемы кансалідацыі. Таму Рада інтэлігенцыі аднавіла кансультацыі з дэмакратычнымі лідэрамі, а таксама з іншымі асобамі, якія выказалі намер вылучацца ў якасці кандыдатаў.

Пра ўсе сустрэчы паведамлялася ў прэсе.

Для тых, хто чытае толькі «Нашу Ніву», паведамляю, што адбыліся сустрэчы з Аляксандрам Мілінкевічам, Віктарам Карняенкам, Віктарам Івашкевічам, Мікалаем Статкевічам, Лявонам Баршчэўскім, Аляксеем Янукевічам, Анатолем Лябедзькам, Аляксандрам Ярашуком, Сяргеем Калякіным, Андрэем Саннікавым, Алесем Міхалевічам, Віталем Рымашэўскім, Аляксандрам Казуліным, Вольгай Карач, Уладзімірам Някляевым, Таццянай Процькай.

Магу засведчыць, што сярод гэтых асобаў ёсць сапраўды вартыя звання «адзінага» і здольныя вырашаць праблемы, з якімі сутыкнецца посттаталітарная Беларусь. Пры размове з імі мы яшчэ раз пераканаліся, што ўсё гэта будзе магчымым, толькі калі ўсе прэтэндэнты свядома пагодзяцца спрацаваць як адна каманда, да якой далучацца ўсе тыя, хто падзяляе супольныя мэты. А калі такой каманды не будзе, пытанне вызначэння «адзінага» проста страчвае сэнс.

Практычна ўсе ўдзельнікі сустрэчаў пагадзіліся з думкай аб неабходнасці кансалідацыі і выхаду на «адзінага». Пераважная большасць пагадзілася з тым, што гэтыя праблемы павінны вырашацца як мага раней, да пачатку збору подпісаў.

Такім чынам, цяпер удзельнікі гэтага працэсу выходзяць на варыянт «круглага стала», на якім яны самі паспрабуюць вызначыць, каму даручыць званне «адзінага». Радзе інтэлігенцыі прапанавана выконваць пры гэтым каардынацыйную ролю. А калі ўдзельнікі «круглага стала» не здолеюць дасягнуць кансэнсусу, кандыдатуру «адзінага» можна вызначыць групай экспертаў. Потым гэтую кандыдатуру можна будзе прадставіць на зацвярджэнне Кангрэсу дэмакратычных сілаў як адказнае калектыўнае рашэнне. І прапанаваць беларускаму грамадству падтрымаць гэтае рашэнне.

Безумоўна, усё гэта магчыма толькі тады, калі ўсе ўдзельнікі гэтага працэсу ўздымуцца да разумення адказнасці за справу, якую яны ўзяліся рабіць. Адказнасці перад Народам, Краінай, перад сваім сумленнем. Калі будуць адкінутыя ўсе кан’юнктурныя, амбіцыйныя ці карыслівыя матывы. Калі мэта будзе толькі адна — пабудова незалежнай, дэмакратычнай, еўрапейскай Беларусі.

Менавіта на такіх пазіцыях стаяла і будзе стаяць Рада беларускай інтэлігенцыі. Паведамляю тым, хто гэтага яшчэ не ведае: сябры нашай Рады здольныя не толькі казаць пра свае намеры, але і адказваць за свае словы.

Яны засведчылі гэта канкрэтнымі вынікамі сваёй прафесійнай дзейнасці, якія прызнаныя не толькі ў Беларусі, але і ў свеце. Будзе недарэчна прыводзіць тут увесь спіс Рады. Але, думаю, варта назваць імёны акадэмікаў Радзіма Гарэцкага, Аляксандра Вайтовіча, Івана Нікітчанкі, паэта і грамадскага дзеяча Генадзя Бураўкіна, мастака Алеся Марачкіна, кінадраматурга Уладзіміра Халіпа, журналістаў Анатоля Гуляева, Святланы Калінкінай, Аляксея Караля, Марата Гаравога, гісторыкаў і грамадскіх дзеячаў Валянціна Голубева і Алега Трусава, генерала і грамадскага дзеяча Валерыя Фралова, дыплamата Пятра Садоўскага. Нагадваю гэта толькі таму, што за апошнія гады ў Беларусі ўтварылася нешта накшталт моды ліць бруд на ўсіх, хто варты павагі і карыстаецца аўтарытэтам у грамадстве. Каму гэта выгадна — здагадацца няцяжка.

А што адбываецца, калі да ўлады прыходзяць асобы, якія ненавідзяць інтэлігентнасць і інтэлігенцыю, паказвае прыклад гісторыі, якую перажыла Еўропа ў XX стагоддзі, і якую дагэтуль перажывае Беларусь. Няўжо некаму мала?..

**З павагай да чытачоў «Нашай Нівы»,**
**Уладзімір Колас,**
**Старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі**




АД РЭДАКТАРА

# Бачылі мы вашы круглыя сталы з Ганчарыкам

**Андрэй Дынько** адказвае Уладзіміру Коласу.

Дапусцім, у 2011 годзе Масква падтрымае не свайго даўняга кліента Аляксандра Лукашэнку, а «адзінага кандыдата ад апазіцыі, вызначанага Радай беларускай інтэлігенцыі». Несумненна, абодва гэтыя праціўнікі будуць выступаць за пабудову незалежнай, дэмакратычнай, еўрапейскай Беларусі. Якім тады будзе твой выбар, чытач?

І хай сцэнар гучыць трохі фантастычна, ён можа аказацца не такім далёкім ад праўды. Падзеі ў Кіргізіі былі званочкам. У 2011 годзе Беларусь чакаюць трохі іншыя выбары, чым усе тыя, да якіх мы звыклі за мінулае дзесяцігоддзе. Не, не ў сэнсе дэмакратычнасці. За падлікам галасоў, як паказалі мясцовыя выбары, ніхто сачыць не дазволіць. Аднак кандыдаты ад апазіцыі будуць мець вельмі розныя матывацыі і планы дзеяння. І ім трэба быць гатовымі, што ацэньваць іх будуць з той жа мерай цынізму, з якой яны будуць дзейнічаць.

Калісьці досыць было выступіць супраць Лукашэнкі і за незалежнасць, каб народ цябе падтрымліваў, і гэта была мудрая падтрымка. Аднак Лукашэнка даўно перайшоў на незалежніцкія пазіцыі, і ягоныя апаненты стаяць перад патрэбай пераацэнкі прыярытэтаў. Што на сёння самае эфектыўнае ў справе нацыябудавання, якое застаецца галоўнай задачай незалежнага грамадства? І якая тактыка здольная найхутчэй наблізіць беларускае грамадства да дэмакратычных вартасцяў?

Гэта былі мае агульныя заўвагі, а цяпер да канкрэтнага пытання працэдуры вызначэння кандыдата на выбары і, шырэй, лідэра апазіцыі на наступныя гады.

Уладзімір Колас гаворыць прыгожыя словы пра «адказнасць перад Народам, Краінай, перад сваім сумленнем. Калі будуць адкінутыя ўсе кан’юнктурныя, амбіцыйныя ці карыслівыя матывы».

Аднак сцэнар, што прапануе Колас, нешта нагадвае. А менавіта 2001 год. Тады кучка бяздарных наменклатурных работнікаў, няздольных нават сабраць 100 тысяч подпісаў у сваю падтрымку, таксама вызначыла адзінага кандыдата шляхам круглага стала, а, калі называць рэчы сваімі імёнамі, шляхам кулуарных камбінацый. Той «адзіны кандыдат» пырхнуў з краіны на сінекуру ў Маскве назаўтра пасля выбараў.

Словы і тады гучалі харошыя. Толькі ніякай адказнасцю і не пахла.

Рымэйк 2001 года — найгоршае, што можа выбраць дэмакратычная апазіцыя ў сітуацыі, калі яе ідэі не толькі жывуць, але і перамагаюць. А яны перамагаюць адна за адной — і незалежнасць, і рынак, і еўрапейскі вектар; лукашэнкаўцы і хапаюцца за ідэі апазіцыі.

Ці не сам Колас, які цяпер цягне на сябе тогу арбітра, у 2006 годзе, калі адзіным кандыдатам аказаўся не ён сам, палец аб палец не ўдарыў у той поўнай ахвяраў кампаніі? Было б добра, каб ён патлумачыў, якое прасвятленне прывяло яго да ўсведамлення патрэбы «кансалідацыі намаганняў» цяпер.

Палітыку фальш даруюць. Дысідэнту, як і маральнаму аўтарытэту, — з цяжкасцю.

Ідэя, каб лідэра апазіцыі вызначылі маральныя аўтарытэты, па-свойму светлая ў сітуацыі, калі апазіцыя загнаная ў паўпадполле. Толькі ў такім выпадку старшынёй рады аўтарытэтаў не павінен быць удзельнік палітычнага працэсу. А сама Рада аўтарытэтаў не павінна фармавацца пераважна з прыхільнікаў пэўнай палітычнай групоўкі (прынамсі, тры з Коласавага спісу самі былі няўдалымі прэзідэнцкімі кандыдатамі). І няма чаго прыкрывацца імёнамі выдатных людзей, якія і не падазраюць, што іх выкарыстоўваюць у якасці шырмы для дасягнення вузкагрупавых інтарэсаў.

Зрэшты, ідэал заўжды недасяжны. Мы ж маем канкрэтную сітуацыю, калі лідэры асноўных груповак апазіцыі не маюць унутранай матывацыі да вылучэння адзінага кандыдата. Вось не маюць, і ўсё. Можа быць, у такой сітуацыі варта дазволіць ім напачатку паказаць, на што яны здольныя паасобку? Прынамсі, у такой сітуацыі непрыстойна размахваць плакатам з надпісам «інтэлігенцыя», каб даказаць, што менавіта твая групоўка мае рацыю.

# Паўсталыя з попелу

**Гурт Scorpions пачаў развітальнае турнэ канцэртам у Мінску. Рэпартаж Паўла Касцюкевіча.**



Юлія Дарашкевіч

Цяпер мы дакладна ведаем, што вывяржэнне ісландскага вулкана — гэта такі піяр-ход гурта Scorpions. Як і ідзя развітальнага тура (які, паводле прызнання саліста Клаўса Майнэ, працягнецца «два з паловай гады — як мінімум») і апошняга альбома, які, паводле словаў гітарыста Рудзі Шэнкера, яшчэ толькі будзе па выніках будучага тура.

У процівагу сваім маладым паслядоўнікам з «Рамштайна», «Скарпы» абышліся без фаер-шоу і калі што і мянялі падчас канцэртаў, дык гэта гітары. І нараканняў на парушэнне нормаў маралі не выклікалі нават у Чаргінца (у каго ж падымецца рука на аўтараў Still Lovin' You?). У свой мінулы прыезд, у 2008-м, Scorpions дэманстравалі на сцэне сюррэалістычнае кіно з сімфанічным аркестрам. Гэтым разам былі простыя дэкарацыі рок-рубілава: пяць мужчынаў у джынсах у абцяжачку і скураных кедах адпялі металічныя рок-н-ролы і слёзныя балады. Фаер-шоу-шмаер-шоу, а вынік той самы — набіткаваная чара вялізнай «Мінск-Арэны» са шматлюдным, пальца не ўсунеш, танцпляцам перад сцэнай. Зноў у нас з'явілася фальшывае адчуванне, што гурт, які дасягнуў творчай стратасферы, толькі тое і робіць, што качаецца ў нябеснай смятане, выбраляючы ў жыцці ўсё, што хоча.

Спярша музыкі цешылі песнямі з новай праграмы Sting in the Tail. Але сапраўды расчулілі першым блокам, па-беларуску кажучы, «голдэн баладс». Send Me an Angel быў прапяяны разам з публікай.

Раз-пораз музыкі хадзілі ў народ па спецыяльна пабудаваных дарожках, якія ніхто не ахоўваў. У прыліве пачуццяў публіка была не ў стане глядзець на веліч зорак уласнымі вачыма, а, дастаўшы мабілкі, назірала іх выключна праз аб'ектыў камераў. А зусім дайшлі мінчукі да кандыцыі, калі вакаліст прабачыўся (другі раз за тыдзень!) за сваё вымушанае спазненне.

Дарэчы, Клаўс Майнэ навучыўся казаць сёе-тое па-беларуску: «Dobry vechar! Jak nastroj?» — гэта ён так афіцыйна павітаўся пасля другой песні. Ну, і, вядома, шматлікія Dziakuj.

Але не забыліся «Скарпы» і пра дэманстрацыю любові да роднай Нямеччыны: адна з гітар Рудзі Шэнкера была пафарбаваная ў металік, а ў яе корпус быў уштукаваны значок «Мерсэдэса». Не здзівімся, калі гадоў праз дзесяць яна, прывезеная з Германіі перагоншчыкамі, з'явіцца ў якога-небудзь айчыннага рокера.

Свой выступ музыкі скончылі Still Lovin' You і Wind of Change. Апошняя песня асабліва дарагая Майнэ, які сказаў, што з радасцю адсвяткаваў з усім светам дваццатую гадавіну заканчэння халоднай вайны, і менавіта гэтае дваццацігоддзе найбольш натхняе яго асабіста.

Каб вечар не выглядаў як «Калыханка для дарослых», пад заслону музыкі ўвалілі задзірлівы хіт Rock You Like a Hurricane.

І як гэта мы (і яны) маглі нават дапусціць думку, што калісьці іх з намі не будзе?

**Павал Касцюкевіч**

МУЗЫКА

## Віктар Шалкевіч ашчаслівіў слухачоў сёмым альбомам

**У Мінску прайшла прэзентацыя «Шчаслівай сямёркі».**

Зала Палаца культуры ветэранаў у Мінску, у якой увечары 28 красавіка прэзентаваў свой альбом гродзенскі бард і актор Віктар Шалкевіч, ідэальна пасуе да такіх мерапрыемстваў. Але з першых акордаў «Такой доўгай зімы» пачало з'яўляцца навязлівае адчуванне, што зала глядзелася б яшчэ больш арганічна, калі б з яе прыбраць шэрагі крэслаў і замест іх паставіць столікі. Уражанне гэтае падмацоўваў акампанемент запрошаных на канцэрт акардэаніста Барыса Фадзіна і скрыпача Вячаслава Панька.

Прэзентуючы мінчукам «Шчаслівую сямёрку» — новыя песні і анекдоты, як пазначана на вокладцы альбома, — Віктар перасыпаў песні новымі і старымі показкамі, якія ўжо самі сабою сталі творамі. Праанансаваўшы песню «Саколка-Беласток», спявак распавёў пра ўласны досвед паездак у Польшчу з мэтай прадаць-купіць. Прывёў колькі красамоўных прыкладаў: «Ездзілі мы з тэатрам, то адна мая калега там косы прадавала — стаяла абстаўленая імі, як смерць», «а аднойчы да гандляроў на беластоцкім кірмашы падышлі два добра апранутыя мужчыны. Дзіка азіраліся на ўсё хараство тавараў. Адзін з іх быў тагачасны міністр МЗС Пятро Краўчанка».



Ладную частку імпрэзы музыка аддаў песням-прысвячэнням беларускім гарадам: Гродну, Валожыну, Навагрудку. Расказваючы пра апошні, Віктар прыгадаў пра рэстаўрацыю навагрудскага замка: «А мо і не варта яго чапаць, бо яшчэ зробяць што не так?»

У новых песнях ад Шалкевіча дастаецца не толькі хрыпата-пазнавальнаму герою «Балады пра «Славянскі базар», але і дэмакратам ды змагарам з рэжымам — «Новыя хвалі радыё «Свабода», «Голуб на секвоі, галубка на пальме» (апошнюю песню, паколькі ў ёй спяваецца пра Швецыю, спявак прысвяціў прысутнаму на канцэрце шведскаму амбасадару Стэфану Эрыксану).

**Сямён Печанко**

КАЛЯНДАР

## Май

1 — Дзень працы.

1 — 300 гадоў таму (1710) салдаты расійскага цара Пятра І узарвалі будынак Сафійскага сабора ў Полацку.

3 — Міжнародны дзень свабоды друку.

5 — Дзень святой Еўфрасінні Полацкай, нябеснай заступніцы Беларусі.

9 — Дзень Перамогі над фашызмам.

9 — Дзень Еўропы.

11 — Дзень святога Кірылы Тураўскага, нябеснага заступніка Беларусі.

18 — 100 гадоў таму памерла Эліза Ажэшка, польска-беларуская пісьменніца, якая жыла ў Гродне.

23 — Тройца ў праваслаўных і каталікоў.

23 — На Палессі адзначаюць Куст.

24 — Дзень славянскага пісьменства.

**Уклаў ЛК**

## Сціслa

• **«Сарока на шыбеніцы» Альгерда Бахарэвіча выйдзе ў Германіі.** Раман беларускага пісьменніка перакладзены на нямецкую мову Томасам Вайлерам. Выхад кнігі ў Нямеччыне плануецца на восень. Урыўкі з рамана сёлета таксама публікаваліся ў чэшскім часопісе «Labirint Revue» ў перакладзе Сяргея Сматрычэнкі.

• **Помнік Міндоўгу і яго жонцы Марце можа з'явіцца ў Латвіі.** З такой прапановай выступілі літоўскія і латвійскія дзеячы культуры. Помнік прапануецца паставіць на ўсходзе краіны, у Аглоне, дзе, паводле легенды, Міндоўга забілі.

• **Беларусы Расіі ствараюць незалежны інстытут у Маскве.** Такое рашэнне было прынятае на з'ездзе Федэральнай нацыянальнай культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі». Стваравецца група «Спадчына» з расійскіх і беларускіх вучоных «для матывацыі таго, што мы робім». Магчыма, за прыклад будзе ўзятая праца ўкраінцаў, якія стварылі ў Маскве Цэнтр нацыянальнай украінскай культуры. Галоўнай задачай інстытута стане вывучэнне беларускай прысутнасці ў Расіі. Таксама на з'ездзе была разгледжана праблема выкарыстання беларускай мовы ў Расіі. І хутка павінна распачацца праца па стварэнні школьных факультатываў мовы ў Маскве.

• **Памёр сябра Быкава Валянцін Аскоцкі.** Расійскі літаратуразнавец быў сябрам Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Васіля Быкава. Дзякуючы намаганням у тым ліку і Аскоцкага, у Расіі з'явіліся публікацыі пра Быкава ў 1960-х. А калі ў Беларусі ў 2000-х пачалася чарговая кампанія супраць пісьменніка, літаратуразнаўца на старонках «Известий» выступіў са зваротам да Уладзіміра Пуціна і Юрыя Лужкова, каб тыя запрасілі Васіля Быкава пераехаць жыць у Расію. Прысутнічаў ён і на пахаванні сябра ў Мінску ў 2003-м. Самога Валянціна Аскоцкага пахавалі на Вагракоўскіх могілках у Маскве.

• **Украіна можа адмяніць 50%-ую квоту на ўкраінскую музыку.** Адпаведны законапраект зарэгістраваны ў Вярхоўнай Радзе. Прапанова падрыхтаваная Партыяй рэгіёнаў. Прадстаўнікі шоў-бізу закляймілі прапанову як здрадніцкую і антыўкраінскую.

• ***Жонка Тома Круза сыграе Жаклін Кенэдзі.*** Амерыканская актрыса Кэці Холмс увасобіць яе ў тэлесерыяле «Кенэдзі». Ён будзе паказаны ў ЗША тэлеканалам History Channel у 2011 годзе.Жаклін Кенэдзі — жонка забітага прэзідэнта ЗША Джона Кенэдзі, яна мела крэўную повязь з Радзівіламі. Кэці Холмс — жонка амерыканскага актора Тома Круза.

**КМ, ЯВ**

# «Грыб не рабіў нічога, каб заблакаваць рэферэндум Лукашэнкі»

**Сяргей Навумчык** палемізуе з Мечыславам Грыбам.

Інтэрв'ю былога старшыні Вярхоўнага Савета 12-га скліканьня, генерал-лейтэнанта Мечыслава Грыба Віталю Цыганкову, надрукаванае ў газеце «Свободные новости плюс» і змешчанае на сайце «НН», якім ён спрабуе паказаць сябе абаронцам дэмакратыі, а дэпутатаў Апазіцыі БНФ — асобамі, якія перашкаджалі яму гэтую дэмакратыю абараняць, вымагае некалькіх удакладненняў.

**Першае.** Апазіцыя БНФ не магла станоўча ўспрыняць абранне Грыба на пасаду старшыні ВС у студзені 1994 г., паколькі раней ён як старшыня Камісіі ВС па абароне і нацыянальнай бяспецы набыў у ВС імідж рэпрэзентанта прамаскоўскіх сілаў. Прыгадаем, што пасля аднаўлення Незалежнасці ў жніўні 1991 г. Апазіцыя БНФ патрабавала стварэння ўласнага войска і фармулявання вайсковай дактрыны, якая б адпавядала інтарэсам Беларусі, а не Расіі. Кіраўніцтва ж вайсковага ведамства і профільная парламенцкая камісія занялі супрацьлеглую пазіцыю.

У 1991—1993 гг. з беларускага войска было звольнена некалькі сотняў афіцэраў — актывістаў БЗВ (Беларускага згуртавання вайскоўцаў), якія жадалі прынесці прысягу на вернасць Беларусі — у той час як у Міністэрства абароны былі пераведзеныя на працу дзясяткі афіцэраў з Расіі, якія абсалютна адкрыта выступалі за аднаўленне СССР. У 1992 годзе «Звязда» надрукавала заяву з гэтай нагоды, падпісаную, акрамя 55 дэпутатамі ВС, Васілём Быкавым і іншымі прадстаўнікамі нацыянальнай інтэлігенцыі. У 1992—1993 гг. значная частка высілкаў БНФ была скіраваная на тое, каб супрацьстаяць уцягванню Беларусі ў арбіту вайсковых інтарэсаў Расіі, якое выяўлялася ў далучэнні да сістэмы Калектыўнай бяспекі СНД. Менавіта М. Грыб як старшыня парламенцкай камісіі выконваў ролю «тарана», які прабіваў уступленне Беларусі ў гэтую сістэму.

Менавіта Грыб і на сесіях, і на Прэзідыуме ВС прымушаў (ці скажам больш мякка — настойліва пераконваў) тагачаснага старшыню ВС Шушкевіча падпісаць дамову аб Калектыўнай бяспецы (што Шушкевіч і зрабіў 31 снежня 1993 г., зрэшты, не ўратаваўшыся ад адстаўкі). Нарэшце, адразу пасля абрання спікерам ВС генерал-лейтэнанта міліцыі М. Грыба міліцыя пачала затрымліваць актывістаў БНФ, чаго з моманту аднаўлення Незалежнасці, ад жніўня 1991-га, не было (першыя затрыманні — пачатак лютага 1994, у стэнаграмах сесіі ВС ёсць выступ аўтара гэтых радкоў з гэтай нагоды).

**Другое.** У сакавіку 1994 года менавіта спікер ВС М. Грыб настаяў на ўвядзенні ў Беларусі прэзідэнцкай улады. Так, ён правёў рашэнне аб галасаванні пайменнымі бюлетэнямі па тых раздзелах Канстытуцыі, якія прадугледжвалі ўвядзенне прэзідэнцкай улады. Гэтае рашэнне супярэчыла Рэгламенту ВС, Апазіцыя БНФ удзелу ў ім не брала і заявіла пра яго нелегітымнасць.

**Трэцяе.** Са слоў Мечыслава Іванавіча складаецца ўражанне, што ў красавіку 1995-га ён нібыта быў на баку дэпутатаў БНФ і выступаў супраць прапанаванага Лукашэнкам рэферэндуму аб змене дзяржаўнай сімволікі, ліквідацыі статусу беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і праве прэзідэнта распускаць ВС. Але дэпутаты БНФ яго, як ён кажа, «кінулі». Насамрэч, спікер М. Грыб не рабіў нічога, каб заблакаваць рэферэндум Лукашэнкі.

Нагадаю, што дыскусія ішла некалькі дзён, дэпутаты Апазіцыі БНФ выступілі дзясяткі разоў, праводзілі кулуарныя перамовы, але менавіта ў тым ліку і таму, што ад спікера М. Грыба не было ніякай падтрымкі, да 11 красавіка 1995 г. мы вычарпалі ўсе магчымасці «парламенцкім» чынам уплываць на сітуацыю. Заставалася галадоўка. Факт, што толькі пасля абвяшчэння намі галадоўкі пытанні, вынесеныя Лукашэнкам на рэферэндум, пачалі не набіраць належнай колькасці галасоў дэпутатаў і «праваливацца».

Аднак 12 красавіка, пасля начнога збіцця дэпутатаў БНФ, М. Грыб вёў сесію цалкам у рэчышчы інтарэсаў Лукашэнкі, хаця раніцай, калі збітыя дэпутаты прыйшлі да яго ў кабінет, быў настроены нібыта рашуча. Я разумею, якія спосабы ўздзеяння маглі прымяніць да М. Грыба ці яго родных людзі з атачэння Лукашэнкі — але не варта ў сваіх дзеяннях (дакладней, адсутнасці дзеянняў) абвінавачваць тых, хто ў сваім супрацьстаянні Лукашэнку быў паслядоўным.

**Чацвёртае.** Абсалютна незразумела, чаму ў сярэдзіне 1995 года Грыб аддаў будынак Вярхоўнага Савета па вул. Карла Маркса Кіраўніцтву справамі прэзідэнта (будынак — скажу ўжо адкрытым тэкстам, — у выпадку моцнай пазіцыі кіраўніцтва ВС, можна было пераўтварыць у крэпасць, што, наколькі мне вядома, цяпер і зроблена Лукашэнкам). Але, як памятаю, і аўтамабіль (-лі), і ахова, і ўрадавая сувязь былі ў спікера ВС Грыба ўвесь 1995 год. І галоўнае — да пэўнага моманту заставалася магчымасць апеляваць да народа. Аднак гэтага Мечыслаў Іванавіч Грыб не зрабіў.

Але **па-пятае**, хацеў бы ўсё ж аддаць належнае Мечыславу Іванавічу за паводзіны падчас першых прэзідэнцкіх выбараў летам 1994 года. Тады Грыб заняў канструктыўную пазіцыю, зразумеўшы, якая небяспека ўзнікае з прыходам Лукашэнкі.

Яшчэ не надышоў час казаць пра ўсе акалічнасці, але калі б такі ж канструктывізм выявіў і Вячаслаў Францавіч Кебіч, Лукашэнка ў выніку выбараў 1994 года прэзідэнтам бы не быў.

**Сяргей Навумчык,**
**каардынатар Апазіцыі БНФ**
**у ВС 12 скліканьня**




**14 мая спаўняецца 15 гадоў з дня правядзення першага ўсебеларускага рэферэндуму. Ён адбыўся ў 1995 з ініцыятывы Аляксандра Лукашэнкі.**

**На рэферэндум было вынесена чатыры пытанні:**

**пра змену дзяржаўнай сімволікі,**

**пра наданне расійскай мове статусу дзяржаўнай,**

**пра падтрымку дзеянняў прэзідэнта, скіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расіяй,**

**пра неабходнасць унесці ў Канстытуцыю змены, што прадугледжваюць магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета прэзідэнтам.**

**Група дэпутатаў Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, якія спрабавалі шляхам галадоўкі пратэставаць супраць правядзення рэферэндуму, была сілай разагнаная.**

**Рэферэндум абазначыў паварот дзяржаўнай культурнай палітыкі ў бок русіфікацыі, а кіраўніцтва — у бок аўтарытарызму. Гэтыя змены былі замацаваныя наступным рэферэндумам, 24 лістапада 1996, калі былі ўнесеныя змены ў Канстытуцыю, якія, фактычна, ператварылі рэспубліку з парламенцка-прэзідэнцкай у прэзідэнцкую.**

**Мечыслаў Грыб:**

— Старшыня Вярхоўнага Савета — член калектыўнага органа, які вырашае, якую лінію праводзіць. Калі адбылося гэта пабоішча (дэпутатаў, якія галадалі ў будынку ВС. — Рэд.), я першы на пасяджэнні прэзідыума ўнёс прапанову, каб нам пасяджэнні праводзіць у іншым будынку, на Карла Маркса, 38, у непрыстасаванай зале. Каб нам не хадзіць у будынак парламента, дзе адбыліся такія гвалтоўныя дзеянні. Але прэзідыум мяне не падтрымаў.

Рэч у тым, што большасць дэпутатаў гэтую галадоўку апазіцыі БНФ не ўспрымалі. Калі Лукашэнка вылучыў свае прапановы на рэферэндум, я не выключаю, што можна было іх адсунуць, неяк змяніць. І тут раптам ні з пушчы ні з поля звалілася гэтая галадоўка. Яна была спантанная, непадрыхтаваная. Яны ж мяне кінулі! Я прыходжу на пасяджэнне, а яны сядзяць, трыбуну аблажыўшы. Дык вы ідзіце да прэзідэнта і там кладзіцеся. Што вы маеце да мяне, да старшыні Вярхоўнага Савета, што вы мне зрываеце ўсю працу?

Сёння яны выдаюць гэта за нейкае дасягненне — ніякага дасягнення тут не было. Калі б было больш цярпення, то маглі б дасягнуць большага.

Што да маёй пазіцыі, то яна не стала больш лагоднай. Калі б яна была лагоднай, то не было б таго, што дэпутатам паўгода не плацілі заробак.

**Паводле «Свободные новости плюс»**



КІНО

## Як Лукашэнка Барадуліну апладзіраваў

У новым фільме рэжысёра Віктара Корзуна «Эпоха Барадуліна» ёсць цікавыя кадры з кінахронікі: Рыгор Барадулін чытае вершы на сцэне Купалаўскага тэатра, а ў канцы выступу гукае ў залу: «Жыве Беларусь!» Спускаецца са сцэны, і тут камера паказвае буйным планам аднаго гледача, які дужа пляскае ў далоні і ўсміхаецца. У гледачы няцяжка пазнаць Аляксандра Лукашэнку першай паловы 1990-х. Побач — Міхаіл Чыгір, за спінай — Ірына Абельская.

Фільм быў зняты на замову тэлеканала «Белсат». Таму найперш яго пабачаць гледачы гэтага незалежнага спадарожнікавага канала.

Фільм Корзуна можна набыць і на дысках у незалежных распаўсюднікаў.

**АК**

## ARCHE, прысвечаны гарадской гісторыка-культурнай спадчыне




З'явіўся чарговы нумар часопіса. Яго тэма — беларускія гарады: якімі яны былі і якімі захаваліся. Мінск у пачатку XVIII стагоддзя Яна Аляшэўскага, сярэдзіны XIX стагоддзя Тадэвуша Корзана, Вільня, Полацк… Выгляд населенага пункта стварае забудова. Таму шэраг публікацый прысвечаны праблеме аховы помнікаў архітэктуры.

Сярод аўтараў нумара — Дзяніс Дук, Іна Соркіна, Тамара Габрусь, Захар Шыбека. Агулам каля двух дзясяткаў гісторыкаў.

Таксама друкуецца цэлая галерэя старых паштовак з выглядамі беларускіх гарадоў і мястэчак.

**КМ**

# У срэбных танах




Маці паэта, Вера Блошкіна, пахаваная на старых гродзенскіх могілках.

**На гродзенскіх кладах ёсць загадкавая магіла. Піша гісторык Андрэй Вашкевіч.**

Ніколі не быў аматарам творчасці паэтаў, якія жылі ў БССР у міжваенныя гады. Аскоміну набілі бясконцыя хваласпевы шчасліваму жыццю беларускіх працоўных пад кіраўніцтвам партыі, якіх досыць яшчэ было ў мае часы ў школьнай праграме. Куды больш падабаліся творы заходнебеларускіх паэтаў: задзірыста-самаўпэўненыя вершы Валянціна Таўлая, суровыя, але светлыя радкі маладога Максіма Танка, сумна-меланхалічная лірыка Хведара Ільяшэвіча...

Верш, асабліва напісаны ў нейкі важны гістарычны перыяд, для мяне заўсёды адлюстраванне эпохі.

Нават калі аўтар гаворыць аб прыгажосці вясновай ночы ці прызнаецца ў каханні дзяўчыне, ён найперш гаворыць пра свой час. І гаварыць гэта ён павінен шчыра. А пра якую шчырасць можна казаць,калі праслаўляеш «правадыра», які загнаў твой народ у калгасы, знішчыў лепшых яго прадстаўнікоў і ўжо трымае пісталет каля тваёй галавы?!

Так я думаў да той пары, пакуль у рукі не трапіла выдадзеная колькі год таму выдавецтвам «Мастацкая літаратура» кніга вершаў рэпрэсаваных беларускіх паэтаў «Сярэбраныя галасы. Душа мая тужлівая...». Творы, змешчаныя ў гэтай кнізе, сталі адкрыццём, дзвярыма ў душы людзей, якія ў пераважнай большасці пайшлі з жыцця ледзь-ледзь дажыўшы да трыццаці




Міхась Багун падчас следства. Фота са справы.

год.

Аказваецца, за класікамі ўздымалася магутнае пакаленне творцаў, якія не проста ішлі «ў рожкі са старымі» і ўсхвалялі савецкі лад. Галоўнымі матывамі іх творчасці было апісанне пачуццяў чалавека, яго адносін з іншымі людзьмі, прыродай і часам. І, што асабліва дзіўна, паміж аптымістычнымі прапагандысцкімі радкамі амаль скрозь адчуваецца нейкае прарочае ўсведамленне кароткага і надта трагічнага шляху іх аўтараў. Сапраўдны срэбны век беларускай літаратуры!

Гартаючы старонкі кнігі, натрапіў на радкі рэпрэсаванага мінскага паэта Міхася Багуна, якія ўжо даводзілася чытаць, але не на папяровых старонках:

Прыйду дамоў і срэбную
Матулю абніму…
Яна кашулю зрэбную
Там латае камусь…
З сваёй усмешкай–казкаю
Павернецца ка мне
І скажа
Гэтак ласкава:
— Страсі, Міхаська, снег.
Што, мусіць, зноў
Са сходу ты,
Сыночак мой, ідзеш?
Глядзі, бо сход, мой залаты,
К дабру не прывядзе!

У другой палове 1990-х на старых гродзенскіх могілках мне паказалі цікавую магілу. На адваротным баку помніка быў прымацаваны медальён са здымкам маладога хлопца, на пярэднім баку — здымак інтэлігентнага выгляду старой жанчыны з надпісам пад ім: «Блошкіна Вера Яфімаўна. 1873 — 1963. «Прыйду дамоў і срэбную Матулю абдыму». Сыны Міхась Багун і Мікалай Пабедзін».

Выходзіла, што ў магіле пахавана маці вядомага паэта, а чалавек на здымку з адваротнага боку помніка — уласна, сам Міхась Багун.

Аднак цела паэта ў магіле ягонай матулі няма. Гэтая магіла сімвалічная, каб разам з памяцю пра маці можна было ўшанаваць памяць брата, магілы якога проста не існуе. Знакаміты беларускі паэт Масей Сяднёў пакінуў нам згадку аб смерці Багуна ў сваіх успамінах аб лёсах беларускіх паэтаў: «Пад гукі «Як умру, то пахавайтэ» на руках Звонака і Мікуліча памёр малады беларускі паэт Міхась Багун. Было гэта ў студзені 1938 г. у Марыінску Навасібірскай вобласці. Арыштаваных трымалі ў нейкай «ліцейцы», дзе па сценах сцякалі чыстыя кроплі вады (на вуліцы было мінус 45 па Цэльсію, а ў «ліцейцы» сотні і сотні людзей)».

З таго моманту, калі гродзенскія краязнаўцы Алесь Госцеў і Уладзімір Васілевіч адшукалі гэтую магілу, прамінула пятнаццаць год. Размовы са старажыламі, літаратуразнаўцамі, пошукі ў Гродне людзей з прозвішчамі Блошкін і Пабедзін нічога не далі.

Магчыма, нехта са сталіцы мае інфармацыю, як маці рэпрэсаванага паэта апынулася ў наднёманскім горадзе і як прайшлі яе апошнія гады?

Матуля паэта пражыла 90 гадоў. Яна дачакалася рэабілітацыі свайго «залатога» Міхаські, якому, як і любая маці свайму дзіцяці, зычыла толькі вялікага-вялікага жыццёвага шчасця. Так не адбылося, але ад словаў на помніку і ад твару жанчыны са срэбнымі валасамі вее такой цеплынёй, што можна з перакананасцю сцвердзіць — гарадзенцы будуць ушаноўваць памяць маці Міхася Багуна не менш, чым памяць маці класіка беларускай літаратуры — Максіма Багдановіча, пахаванай зусім недалёка ад магілы Веры Яфімаўны Блошкінай.

**Багун Міхась**

[сапр. Блошкін Міхаіл Фёдаравіч; іншыя псеўданімы і крыптанімы: Асака М; Багунец; М.Б.; Міх. Б.; Баг.; 9.11.1908, Мінск — 17.2.1938], паэт, празаік, перакладчык. Пачаў друкавацца ў 1925; у сваёй рамантычнай творчасці адгукаўся на падзеі ў краіне. Асаблівы ўплыў на яго аказала паэзія У.Маякоўскага. У 1928 скончыў курсы пры МБПТ; настаўнічаў у в. Рожна Бягомльскага р–на. У 1931—1932 супрацоўнічаў з газ. «Чырвоная Полаччына». У 1932 вярнуўся ў Мінск, дзе працаваў стыльрэдактарам Белдзяржвыдавецтва. У 1935—1936 літсупрацоўнік «ЛіМа». Некаторыя яго вершы, пакладзеныя на музыку, шырока вядомыя ў народзе, увайшлі ў фальклорныя запісы. Займаўся перакладамі з расійскай мовы. Арыштаваны 4.11.1936, прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі. Знясілены і хворы памёр у перасыльным лагерным пункце. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 29.12.1954.

## МІХАСЬ БАГУН

### ЦІХІЯ НОЧЫ

Вясна і ноч…
Такая ноч,
Якіх пад месяцам нямнога,
Цячэ пахучае віно
Над атуманенай дарогай.
І грудзі п'юць
Вясновы пах
Кілішкам радасці і волі,
І месяц, выплыўшы на дах,
У кудлатай сіні засваволіў.
Вясна і ноч…
Растуць у палёх
Сляпыя крыллі летуценняў,
А ў далях свецяцца,
Як лёд,
Азёр люстраных светацені.

# Знакі прыпынку



**Уладзімір Някляеў.**

***

Мітрапаліт Смаленскі і Калінінградскі Кірыл (цяпер — патрыярх Маскоўскі — Рэд.) напярэдадні XI Сусветнага рускага народнага сабора дае інтэрв'ю праграме «Вести». Разважае пра тое, што саборнасць ёсць традыцыя рускага праваслаўя і рускай дзяржаўнасці... і далей гоніць вецер, ды вядучы ўмешваецца і пытае: «Уладыка, як вы лічыце, чаму Расія, на тэрыторыі якой ад 30 да 40 адсоткаў сусветных прыродных багаццяў, была і застаецца жабрацкай краінай?» Уладыка зноў пра сваё, запаветнае: саборнасць, маўляў, заклала падмурак рускай дэмакратыі... але вядучы ўчэпісты: «Уладыка, чаму пры гэткіх прыродных багаццях Расія ўсё ж жабрацкая краіна?..» Далей рабіць выгляд, нібы ці не чуеш, ці не разумееш, пра што пытаюцца, не выпадае, і мітрапаліт адказвае:

«Вось на гэта якраз і павінен адказаць XI рускі сабор».

Відно, як вядучаму карціць спытацца: «Чаму ж не адказаў дзясяты?..» — але ён стрымлівае сябе і кажа: «Дзякуй, уладыка».

***

З фінскім журналістам, якога мне Юкка Малінэн падсеяў, еду ў Мінск. У купэ, натуральна, выпіваем. Журналіст — усю дарогу пра Лукашэнку. Мне, падпітаму, абрыдла: «Ды што ты прычапіўся! Хто ён такі! Ён яшчэ нікім быў, калі мяне ўжо кожны сабака ведаў!..»

Першае, што робіць сабака-журналіст у Мінску — уключае дыктафон і пытаецца ў хлопца з дзяўчынай, якія ідуць да ўваход а ў метро: «Вы паэта Уладзіміра Някляева ведаеце?..»

Я пахваліўся і забыўся, а ён запомніў.

У журналіста відавочны акцэнт, а да акцэнтаў беларусы адносяцца з піетэтам. Таму маладая пара хоць і спяшае, але спыняецца. У вачах дзяўчыны бачу я светлую пустату, бо з той пары, «калі мяне кожны сабака ведаў», прамінула амаль дзесяць гадоў — і ажно дрыжыкі мяне прабіраюць: «Во зараз сораму будзе!..» Але дзяўчына раптам кажа: «Дык ён памёр...»

Калі б мне раней сказалі, што пamерці іншым разам бывае так хораша, я б не паверыў.

***

Спытаўся ў саснёнага Бога: «У чым сутнасць майго жыцця? Дзеля чаго я на свеце?..» Бог адказаў: «Дзеля апошняга імгнення. Уся сутнасць твайго жыцця ў апошнім імгненні».

У сне я падумаў, што пачуў банальнасць. Ці нават глупства, калі Бог не схітраваў. Што можа стацца ў тое апошняе імгненне?

Прачнуўшыся, зразумеў, што гэта не банальнасць. Тым больш — не глупства. Бог не кажа глупстваў нават у сне.

***

У пошуках праўды страчваеш шчасце.

***

Тры радасці жыцця: жанчыны, сябры, алкаголь.

Першымі робяцца лішнімі ў тваім жыцці і сыходзяць з яго жанчыны. За імі — хто ўслед за жанчынамі, хто адначасова з імі — сябры. Застаецца з табой алкаголь, ды аказваецца, што без жанчын і сяброў і ён без патрэбы.

У канцы шляху зноў, як і ў пачатку, ты ні з кім і ні з чым.

***

Калі туманам наплываюць (а яны наплываюць туманам) настальгічныя ўспаміны пра савецкае мінулае, дзе я, найчасцей, стаю на сцэне перад тысячамі людзей, дастаткова чвэрць гадзіны пагартаць «Архіпелаг Гулаг» — і туман сплывае. І тыя тысячы людзей — зэкі, а я пастаўлены на сцэну лагерным начальствам туманіць ім мазгі.

ХАКЕЙ

# Бітва ў Кёльне: Занкавец супраць Хэнлана

Ад 7 да 23 мая ў Германіі пройдзе 74-ы чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. У 11-ы раз зборная Беларусі возьме ўдзел у матчах элітнага дывізіёна.




У групу «А» разам з Беларуссю трапілі Расія, што перамагала ў двух апошніх чэмпіянатах свету, паўфіналісты Алімпіяды са Славакіі, а таксама Казахстан, якія вярнуўся ў найвышэйшы дывізіён.

Гуляць беларусы будуць у Кёльне на «Ланксес-Арэне». А матч адкрыцця першынства паміж зборнымі ЗША і Германіі пройдзе ў Гельзенкірхене на футбольнай «Фелтынс-Арэне» — дзеля гэтага на ёй заліюць лёд. Арэна змяшчае 75 976 гледачоў. Такім чынам будзе пабіты рэкорд наведвальнасці матчаў хакейных чэмпіянатаў свету.

Для выхаду з групы беларусам дастаткова заняць не апошняе месца. Калі гэта ўдасца, у кваліфікацыйным раўндзе нашы хлопцы сустрэнуцца з трыма найлепшымі камандамі групы «D», дзе сабраліся ЗША, Германія, Данія і Фінляндыя.

На чэмпіянат зборная едзе з новым галоўным трэнерам, 41-гадовым Эдуардам Занкаўцом. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што яшчэ летась Занкавец дапамагаў у зборнай канадцу Глену Хэнлану. У Кёльне ж Занкавец і Хэнлан, які пасля беларускай узначаліў славацкую зборную, будуць па розныя бакі барыкадаў.

На мінулым чэмпіянаце ў Швейцарыі беларусы змаглі трапіць у васьмёрку наймацнейшых. Сёлета ад каманды чакаюць не менш паспяховага выступу.

Сярод тых, хто пакуль не даехаў у зборную — браты Касцыцыны. Іх «Манрэаль» у Кубку Стэнлі нечакана перамог у серыі «Вашынгтон», а цяпер яны будуць змагацца з «Пітсбургам». Траўмаваны таксама Канстанцін Кальцоў з «Салавата Юлаева».

Быў скандал і з нашым асноўным варатаром Андрэем Мезіным, які нават пакінуў базу зборнай і з'ехаў у Кіеў, бо мінскае «Дынама» не хацела працягваць з галкіперам кантракт. Але потым пытанне з Андрэем было вырашана станоўча. Ён будзе на чэмпіянаце.

Што да небеларускіх справаў чэмпіянату, то цікава, ці паўторыцца трэці год запар фінал паміж Расіяй і Канадай. Але што зробіш, класіка жанру.

**Зміцер Панкавец**

**Расклад гульняў зборнай Беларусі**

**9 мая** (нядзеля). Беларусь — Казахстан. **Пачатак у 17:15.**
**11 мая** (аўторак). Беларусь — Славакія. **Пачатак у 21:15.**
**13 мая** (чацвер). Расія — Беларусь. **Пачатак у 17:15.**
Для тых, хто не зможа падтрымаць зборную ў Германіі, будуць прамыя трансляцыі на тэлеканале «Лад».




## КАНЦЭРТЫ

**Турнэ «Океана Ельзи»**

«Океан Ельзи» наведае Беларусь падчас тура ў падтрымку новага альбома «Dolce Vita». Маршрут украінскіх музыкаў: **Бабруйск (11 мая), Мінск (12 мая), Баранавічы (15 мая), Гродна (16 мая), Гомель (18 мая), Брэст (19 мая).** А **22 мая** «ОЕ» выступіць разам з **Горанам Брэгавічам** у якасці хэдлайнераў на трэцім рок-фестывалі «Stare Misto» **у Львове.**

**Vinsent у «Рэактары»**

**7 мая ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** пройдзе канцэрт рэпера Vinsent'а. Імпрэза адбудзецца ў фармаце фэсту беларускамоўнай рэпмузыкі. Vinsent мае непаўторны стыль. Магутная падача, гульня словаў, выдатныя лірычныя і сацыяльныя тэксты не пакідаюць слухачоў абыякавымі. **Пачатак а 19-й.**

**Камоцкі ў Купалаўскім**

**5 мая а 19-й на Малой сцэне Купалаўскага тэатра** выступае Алесь Камоцкі з праграмай «Мітусня каляровых дзён». Спосаб набыцця квіткоў толькі адзін — патэлефанаваць (029) 253-25-04 і набыць, і ніяк іначай.

## ІМПРЭЗЫ

**Фотафорум**

**11—14 мая ў «БелЭкспа» (вул.Купалы, 27)** — 4-ы фотафорум. Гэтым разам выстававачная актыўнасць засяродзіцца вакол асноўных цэнтраў: экспазіцыі Мінскага фотасалона і фоташоу ад асноўных прафесійных студый.

**Зорныя будкі для сяброў**

**10 мая а 13-й у гадавальніку для жывёл (вул.Гурскага, 42)** адбудзецца сацыяльная акцыя «Зорныя будкі для сяброў». Мэта акцыі — прыцягнуць увагу людзей да праблемы бяздомных жывёлаў.

**Парад феерверкаў**

**8 мая ў «Лагойску»** пройдзе фестываль «Парад феерверкаў». Гледачы змогуць убачыць выступ найлепшых піратэхнікаў Беларусі, Расіі, Украіны, а таксама ваенна-гістарычнае шоу трох эпох: Вялікага Княства Літоўскага, напалеонаўскіх войнаў і Другой сусветнай. Да пляцоўкі феставалю можна дабрацца сваім аўта (паркоўка на тысячу машын) і на бясплатным аўтобусе, што будзе курсіраваць ад Нацыянальнай бібліятэкі. **Пачатак а 17-й.**

## ВЫСТАВЫ



**Закаханы садоўнік**

**18 мая ў галерэі «Мастацтва» (пр.Незалежнасці, 12)** адчыняецца выстава жывапісу маладых мастакоў з Гомеля Ганны Сілівончык і Васіля Пешкуна. Выстава завецца «Закаханы садоўнік» і ўсхваляе вясну, каханне і прыгажосць свету. **Пачатак а 18-й.**

**Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда**

**5 мая а 17-й у Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** — адкрыццё выставы «Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда». Экспануюцца творы Маціса, Міро, Пікасо, Лежэ, самога Шагала... **Выстава працуе да 23 мая.**

**Ноч музеяў**

**15 мая** Мастацкі музей возьме ўдзел у міжнародным арт-праекце «Ноч музеяў». **Ад 19.00 да 00.00** музей запрашае на «Вечар у французскім стылі». Продаж квіткоў — ад 5 мая.

**Інструменты пакарання ў Сярэднявеччы**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) ад 6 мая да 6 чэрвеня** працуе выстава «Інструменты пакарання ў Сярэднявеччы». Выстаўленыя дакладныя копіі сярэднявечных інструментаў катаванняў з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Наведванне выставы дзецям да 10 гадоў без дарослых не рэкамендуецца.

**Галерэя гістарычных дзеячаў Марачкіна**

Да 70-годдзя мастака Аляксея Марачкіна прымеркаваная яго выстава «Постаці гісторыі і культуры Беларусі». Гэта і даўно знаёмыя вобразы Кастуся Каліноўскага, Міхала Клеафаса Агінскага, і новыя працы — паўстанка Эмілія Плятар, генерал Булак-Булаховіч, рэвалюцыянерка Палута Бадунова. **Выстава працуе на сядзібе БНФ (пр.Машэрава, 8).**

**Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі**

**У Гістарычным музеі да 10 мая** працуе выстава «Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі». Дакументы, фатаграфіі, газетныя публікацыі, кнігі, размешчаныя на выставе, раскажуць пра цікавую асобу — Рышарда Капусцінскага.

**Фотавыстава Лянкевіча ў Варшаве**

Выстава-прэзентацыя здымкаў Андрэя Лянкевіча, прысвечаная выбітным беларусам, якія жывуць у Польшчы, пройдзе **17 мая ў кавярні «Mesita» (ul. Sienna, 93, Warszawa). Адкрыццё а 19-й.**

## ТЭАТРЫ

**5 мая**
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**6 мая**
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»

**7 мая**
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

**8 мая**
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»

**10 мая**
**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**11 мая**
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

## КІНО

# *Жалезны чалавек — 2*

**Iron Man-2**
ЗША, 2010, каляровы, 124 хв.
**Рэжысёр:** Джон Фаўро
**Ролі выконваюць:** Роберт Даўні-малодшы, Мікі Рурк, Гвінэт Пэлтраў, Скарлет Ёхансан, Сэм Рокуэл, Сэмуэл Л.Джэксан
**Жанр:** Комікс паводле твораў кампаніі «Марвэл»
**Адзнака:** 4,5 (з 10)




Амерыка дасягнула піка развіцця. Ворагі зніклі альбо разгромленыя. Нудзіцца без сур'ёзнай работы і Жалезны чалавек, адно са шматлікіх увасабленняў супермэна-абаронцы. Яшчэ ў гэтай глабалісцкай казцы, знятай паводле комікса, выяўляецца, што пад сталёвай маскай хаваецца мультымільярдэр.

Але раптам з'яўляецца праціўнік — расійскі бомж-фізік з лазернымі пугамі (Мікі Рурк). Гэты шыкоўны персанаж з доўгімі калматымі патлямі і наколкамі Бутыркі. Жалезныя фіксы, зубачыстка ў куце рота, папугай на плячы, бандыцкі позірк і геніяльныя здольнасці фізіка — самае тое, каб ажывіць комікс.

Падлеткі ўпадабаюць таксама харэаграфічныя фінты Скарлет Ёхансан, зацягнутай у чорны латэкс, ды фінальную страляніну.

Астатнім хопіць нуды.

**Андрэй Расінскі**



# Грошы, якія нельга памацаць

## Якія сістэмы электронных аплат найчасцей выкарыстоўваюцца ў Беларусі?

Хоць электронныя грошы і выглядаюць для большасці людзей чымсьці загадкавым, дзейнасць гэтага фінансавага сектара ў Беларусі ўпершыню трапіла ў прававое поле даволі даўно — яшчэ ў 2003 годзе. Тагачасная пастанова Нацбанка №201 «Аб зацвярджэнні правілаў ажыццяўлення аперацый з электроннымі грашыма», хоць і з прынятымі ўдакладненнямі, застаецца актуальнай да гэтага часу.

Насуперак пашыранаму меркаванню, звычайныя банкаўскія карткі не з'яўляюцца электроннымі грашыма. Галоўнае ў электронных грашах тое, што банкаўскія рахункі патрэбныя толькі пры ўводзе і вывадзе грошай з сістэмы. Пры гэтым выкарыстоўваецца рахунак банка, а не кожнага асобна ўзятага карыстальніка. А вось у банкаўскіх картках кожны карыстальнік мае ўласны рахунак.

Асноўны прынцып працы электронных грошай: карыстальнік указвае ў інтэрнэце свой асабісты нумар, суму аплаты і — у залежнасці ад сістэмы — кантрольны код. Сістэма пасылае на рахунак крамы электронныя грошы з рахунка карыстальніка. Атрымальнік звяртаецца ў працэсінгавы цэнтр, каб атрымаць пацверджанне сапраўднасці грошай і квітанцыю аб аплаце. Калі грошы прымаюцца, квітанцыя дасылаецца і пакупніку. Калі кантрольны код папярэдне не выкарыстоўваўся, карыстальнік мусіць пацвердзіць аперацыю.

Істотны момант, на які шмат хто не звяртае ўвагу, — з даходаў ад электронных грошай таксама плаціцца падаткі. Праўда, у падатковым кодэксе ёсць агаворка, што падаткам не абкладаюцца падарункі, атрыманыя ад фізічных асобаў, якія не перавышаюць 17,5 мільёна рублёў.

### Якую сістэму абраць?

Асноўныя плацёжныя сістэмы, якія найчасцей выкарыстоўваюць жыхары Беларусі, — EasyPay, «Яндэкс.Грошы» і WebMoney.

### EasyPay

Першая, уласна беларуская сістэма — EasyPay (www.easypay.by). Яна была створана Белгазпрамбанкам у лістападзе 2004 года і дзейнічае на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Грошы на рахунак можна пакласці амаль у 3000 пунктах па ўсёй тэрыторыі краіны: у паштовых аддзяленнях, большасці банкаматаў, а таксама праз банкаўскія пераводы. Забраць свае грошы можна як наяўнымі, так і залічыць іх на рэальную банкаўскую картку. Праўда, у любым выпадку камісія складзе 2%.

Якія арганізацыі працуюць з сістэмай? Праз EasyPay можна аплаціць усе камунальныя паслугі і паслугі сувязі. Апроч таго, з электроннымі грашыма працуе большасць інтэрнэт-крамаў. У дадатак — букмекерскія канторы, латарэі, білеты «Белавія», касметыка... Галоўны мінус — міжнародныя плацяжы сістэмай не падтрымліваюцца.

Максімальная сума плацяжу складае мільён рублёў.

### «Яндэкс.Грошы»

Досыць распаўсюджаная на тэрыторыі Расіі сістэма — «Яндэкс.Грошы» (money.yandex.ru). Яна працуе з 2002 года. Расійскія камунальныя плацяжы беларусаў не цікавяць, але ёсць шэраг іншых карысных катэгорый. Напрыклад, білеты ў тэатр і на канцэрты, аплата ліцэнзій камп'ютарных праграм, браніраванне гатэляў і пакупка білетаў на авія- і аўтобусныя рэйсы.

Нязручнасць для беларусаў у аддаленасці офісаў кампаніі. Калі без дай прычыны рахунак будзе заблакаваны — а пра гэта служба бяспекі кампаніі не папярэджвае, — прыйдзецца адпраўляцца ў Маскву, каб даваць пісьмовыя тлумачэнні па выстаўленых прэтэнзіях. Такой лічыцца, напрыклад, выкарыстанне «Яндэкс.Грошай» для камерцыйнай дзейнасці.

Каб карыстацца сістэмай, прыйдзецца прызнаць сябе грамадзянінам Расіі. Па правілах паслуга прадастаўляецца толькі ім.

Камісія за здыманне грошай складае ад 2% да 5%, але за перавод грошай на беларускую картку працэнт можа быць яшчэ большым. Праблемы і з тым, каб купіць «Яндэкс-грошы». Для гэтага трэба альбо шукаць прыватныя аб'явы ў інтэрнэце, альбо купляць іншыя інтэрнэт-грошы, а пасля канвертаваць іх у «Яндэкс».

### WebMoney

«Іншыя грошы» — гэта, напрыклад, WebMoney (www.wmbelarus.com). Створаная ў 1997 годзе, сістэма мае больш за 10 мільёнаў зарэгістраваных карыстальнікаў. Гарантам з беларускага боку выступае «Тэхнабанк». Ён адказвае за працу WMB-грошай. «B» у канцы слова сімвалізуе беларускі рубель і фактычна роўна яму. Такія ж падраздзяленні маюцца ў Расіі, Украіне, Узбекістане. За беларускія інтэрнэт-рублі можна аплаціць тое ж самае, што за EasyPay — камунальныя і сувязь.



А вось WMZ — гэта ўжо аналаг даляра. Ім можна расплачвацца па ўсім свеце. Каб легальна пераўтварыць WMZ-грошы ў наяўныя, трэба абавязкова звярнуцца ў «Тэхнабанк», перавесці суму ў WMB, і толькі пасля атрымаць эквівалент у нацыянальнай валюце. Недаверу аперацыі дадае той факт, што, па чутках, «Тэхнабанк» абавязаны даваць справаздачу аб усіх аперацыях з WebMoney ў падатковыя інспекцыі Беларусі. Таму шмат хто — у абыход закона — шукае прыватныя аб'явы накшталт «мяняю 100WMZ на $99». Каб легальна купіць WMZ, зноў-такі трэба прайсці дзве прыступкі, адна з якіх — прамежкавая канвертацыя ў WMB.

Дарэчы, для працы з WebMoney з сайта сістэмы трэба ўсталяваць на камп'ютар спецыяльную праграму.

**Яўген Васількоў**

ЗДАРОЎЕ

# Каб лета радавала

Мы як след рыхтуемся да зімніх хваробаў: дбайна правяраем, ці ёсць лекі супраць тэмпературы, прастуды і насмарку. Але няшмат хто ўспамінае, што лета таксама мае колькі непрыемных сюрпрызаў у выглядзе боляў і хваробаў, выкліканых спякотай і летняй актыўнасцю чалавека. Якія гэта болі і як іх можна прадухіліць?



**Галаўны боль.** Ён можа быць выкліканы некалькімі прычынамі, сярод якіх улетку не апошняе месца займае абязводжванне. Большасць людзей забывае выпіць неабходную колькасць вадкасці. У летнюю спякоту рэкамендуюць піць 8—10 шклянак вады жанчынам і 10—12 — мужчынам.

**Апёкі як вынік задоўгага знаходжання на сонцы.** Беларусы любяць загараць. Між тым, дактары даказалі: сонечныя апёкі павялічваюць рызыку раку скуры. Каб не апячыся, не выходзьце на пляж у гадзіны актыўнага сонца (з 10-й да 15-й), заўсёды карыстайцеся крэмам супраць загара (нават калі хочаце загарэць). Калі сонца ўсё ж узнагародзіла вас апёкам, дык найлепш яго змазаць гелем, які змяшчае алоэ (Aloe Vera), і пасля перайсці ў халаднаватае памяшканне.

**Болі ў спіне і нагах.** Гэта ўсё «зручны» абутак з нізкім абцасам, з плоскай асновай, які ніяк не фіксуе нагу. Што рабіць? Насіць сандалі/басаножкі з артапедычнай сцілкай.

**Ліза Кавальчык**

АЎТА

## Беларусь будзе збіраць кітайскія аўтамабілі?

Адноўленыя перамовы з кітайскай кампаніяй Chery. Пра гэта 28 красавіка на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення прамысловасці, транспарту і сувязі Мінэканомікі Уладзімір Дзернавы.

Ён нагадаў, што яшчэ летась распрацоўваўся бізнес-план па стварэнні вытворчасці ў Беларусі кітайскіх легкавых аўтамабіляў. Арыенціровачны кошт праекта складаў каля 260 млн даляраў.

Аднак па просьбе кітайскага боку распрацоўка бізнес-плана была прыпынена. »Мінулы год быў крызісным, таму распрацоўка бізнес-плана і яго ўзгадненне не былі даведзены да завяршальнага этапу», — адзначыў Дзернавы.

Таксама, паводле яго слоў, кітайскі бок вылучыў беларускаму боку шэраг невыканальных патрабаванняў, у прыватнасці, па аб'ёмах інвестыцый у рэалізацыю праекта і патрабаванне, якое тычыцца гарантаваных паставак аўтамабіляў на расійскі рынак.

У сваю чаргу, намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў нагадаў, што кампанія Chery выйграла конкурс на арганізацыю ў Беларусі вытворчасці легкавых аўтамабіляў.

«Пакуль не магу каментаваць, які гэта будзе аўтамабіль, але кітайскае аўтамабілебудаванне актыўна развіваецца. І не здзіўлюся таму, што яны будуць выціскаць еўрапейскіх вытворцаў легкавых аўтамабіляў», — адзначыў Філонаў. Акрамя таго, нагадаў ён, кітайскі вытворца легкавых аўтамабіляў Geely купіў шведскі канцэрн Volvo больш чым за 2 млрд даляраў. «Гэта таксама сведчыць аб вялікім патэнцыяле кітайскага аўтамабілебудавання», — падкрэсліў намеснік міністра.



**БелаПАН**

Сапраўдная беларуская кухня

### Суп з квяцістай капусты

1,25—1,5 кг ялавічыны, соль, морква, 1—2 цыбулі, 1 парэй, 0,5 сельдэрэю, 1 пятрушка, 2—3 качаны квяцістай капусты, 2—3 жаўткі, 2 лыжкі масла, 1 лыжка мукі, 1 французская булка, 0,5 шклянкі вяршкоў.

Квяцістую капусту ачысціць, парэзаць на кавалкі і адварыць у падсоленай вадзе. Некалькі самых прыгожых кавалкаў пакласці ў супніцу, астатнія працерці праз сіта, дадаць муку, падсмажаную з маслам, і усё гэта ўсыпаць у булён, згатаваны з ялавічыны з дадаткам звычайнага набору гароднінны (морквы, цыбулі, парэю, сельдэрэю, пятрушкі), размяшаць, закіпяціць і працадзіць. Запраўляць булён жаўткамі, моцна ўзбітымі разам з вяршкамі, і падаць з грэнкамі.

### Грэнкі з булкі і хлеба

З булкі або хлеба зняць скарынку і парэзаць кубікамі або палоскамі. На патэльню кладуць з лыжку растопленага масла, на масла грэнкі і на некалькі хвілін ставяць у печ. Грэнкі павінны зарумяніцца.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1864 г.**

Прыватныя абвесткі


ПАДАРОЖЖА

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 16 мая па маршруце: Мінск—Белавічы—Струбніца—Пескі—Пацавічы—Самуйлавічы Дольныя—Вялікая Рагозніца—Краманіца—Мінск. Т.: (029) 111–73–32.

КВАТЭРА

**Здам** двухпакаёвую кватэру. Т.: (029) 757–94–07.

**Беларускамоўныя** хлопец з дзяўчынаю здымуць у Мінску аднапакаёвую кватэру. Прапановы прымаюцца на нумар: (029) 782–88–81.

ПРАЦА

**Дапаможам** у стварэнні розных тэкстаў. Хуткасны набор (можна па тэлефоне з аўдыяносьбіта), рэдактура, падрыхтоўка рукапісу, пераклад, распаўсюд, розныя жанры і стылі, віншавальныя вершы. alesprof@tut.by

КНІГІ

**Абмен** кнігамі, культурніцкай інфармацыяй. Канферэнцыі, семінары, літаратурныя вечарыны, перфомансы. Кансультацыі па падборы адпаведнай інфармацыі. Дашлем спіс прапаноў, чакаем Вашых. alesknigi@mail.ry


**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Кемікі**



**1.** Як атрымаць лічбу «5» чатырма «2»?

**2.** Як запісаць 100 пяццю «5»?

**3.** Як, карыстаючыся лічбай 1 пяць разоў, атрымаць 100?

**4.** Маем лічбы 0, 1, 2, 3. Трэба запісаць імі самы вялікі і самы малы чатырохзначны лік.

**5.** Двухзначны лік раздзялілі на 8 і атрымалі 9 і самы большы астатак, які можа быць пры дзяленні на 8. Які лік дзялілі?

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы на старонцы 16.**

## Шыкоўныя паштоўкі па-беларуску

Сучасны віншавальны дызайн, пажаданні, прызнанні... Такой прадукцыі ў масавых колькасцях у Беларусі раней не было. Калі не лічыць строгія «Віншую!» і «Са святам!», афармленне якіх мала мянялася з 1970-х. Ідэя вырабіць вясёлыя віншавалкі на нашай мове прыйшла дызайнеру і прадпрымальніку Раману Шыку. З падказкі ягонай дзеўчыны. Раман кажа, што паштоўкі добра раскупляюць. Нават супрацоўніцы кнігарняў збягаюцца паглядзець на іх, калі здае свой тавар на рэалізацыю.

Паштоўкі можна купіць ужо ў 23 месцах у Мінску. Сярод іх — ГУМ (другі паверх), «Кнігарня пісьменніка», «Кнігачэй», «Асвета».

**ЛК**







**Помнік беларускім сланам. У мінскім мікраараёне «Усход» на пацеху дзятве ўсталявалі гарадскую скульптуру першабытнай сям'і: маманта, маманціху і маманцяня.**





**Работнікі баранавіцкіх прадпрыемстваў творча падышлі да стварэння першамайскіх лозунгаў. Ідуць работнікі банка.**





**А мы думалі гэта лікёр! Кілбасу з назвай Amaretto робяць на Сноўскім мясакамбінаце. І сноўцы не адзіныя: Магілёўскі мясакамбінат зрабіў гатунак салямі «Беларуская амарэтта», дык ён нават узяў медаль на выставе «Зроблена ў Беларусі».**





**Міс Беларусі — 2010 стала чарнявая гарадзенка Людміла Якімовіч. На конкурс яна трапіла выпадкова, паслухаўшы сяброўку. У якасці прыза Людміла атрымала карону з дыяментамі (у часовае карыстанне) і 50 млн рублёў (у давечнае).**

### Анекдоты



***

Паводле навуковых даследаванняў, сярэднестатыстычны беларус праходзіць за год 1440 км. Паводле ж Мінстата, сярэднестатыстычны беларус выпівае 86 літраў піва за год. З усяго гэтага можна зрабіць натхняльную выснову, што, запраўлены літрам піва, сярэднестатыстычны беларус можа прайсці 16,74 км. Сярэдні ж расход піва ў беларускім арганізме складае 5,97 л на 100 км.

***

Хай лепей твой выкладчык не ведае, што ты існуеш.

***

Прагназаваную перамогу атрымалі расійскія баксёры на чэмпіянаце Еўропы па шахматах.

***

Малы ў заапарку пабачыў сланоў. Уражаны, ён просіць бацьку купіць яму хоць бы аднаго:

— Але мы проста не зможам яго пракарміць!.. — спрабуе «адбіцца» бацька.

— Тады давай возьмем таго, перад якім напісана «Карміць забаронена!»

***

— Адзінае, што зараз магу сабе дазволіць, гэта музыку, жанчын і віно, бо газ, прадукты і кватплата мне не па кішэні.

***

У рынкавай эканоміцы не бывае тавараў, якія нікому не трэба! Бывае мала маркетынгу...

### «НН» сто гадоў з вамі

**Капыль.** На самай высокай гары нашага мястэчка стаіць старая хатка. Жыве ў ёй нейкая Ягорыха, муж якой ужо дзевяць гадоў у Амерыцы. Абы настала ноч, цягнуцца да яе ўсе мясцовыя абломкі... Стол аж угінаецца ад пірагоў і бутэлек. Ну, але хай бы і так было... але нашто яна цягне і зазывае на гэтыя гульні маладых дзяўчат? Дрэнная там кампанія для іх!

**«НН». №19. 1910**

**Добры ў пасёлку Нарач базар** — еш вэнджаныя прысмакі ды півам запівай. Хвалі выкінуць вугра на бераг, мясцовыя прадпрымальнікі звэндзяць умомант, купляй ды не вельмі з імі таргуйся, бо тавар у іх першы сорт — дарма што рыба здохла яшчэ ў возеры, атручаная невядома чым.

**«НН». №18. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

**1.** 2×2+2:2=5; **2.** (5+5+5+5)×5=100; **3.** 111−11=100; **4.** 3210, 1023; **5.** 79:8=9 (аст.7)

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, аднoўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6340.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 04.05.2010.
Замова № 2148.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614